Пролетарыі ўсіх краёў, злучайцеся!

Савецкая Беларусь

Органа Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту Саветаў БССР.

10 год выданьня

ШТОДЗЁННАЯ ГАЗЭТА

№ 268 (2757) Панядзелак, 25-га лістапада 1929 г.

АДРЭС РЭДАКЦЫІ: МЕНСК, рог вуліц Ленінскай і Карла Маркса (2-гі Дом Саветаў).

ТЭЛЕФОНЫ: Рэдакцыі—№ 478. Рэдактара—№ 769.

Матар'ял прымаецца—з 9-й да 3½ гадз.

Невыкарыстаныя рукапісы назад аўтарам не вяртаюцца.

КАНТОРА: Менск, рог вуліц Ленінскай і Карла Маркса. Тэлефон № 244. (2-гі Дом Саветаў).

ПАДПІСНАЯ ПЛАТА: На 1 месяц — 90 к. • 3 • — 2 р. 70 к. • 6 • — 4 р. — к. • 1 год — 8 р. — к. Зьмена адрасу: іншагародняя — 20 к. мясцовая — 10 к.

ПЛАТА ЗА АБВЕСТКІ: За радок шапіраму пасьля тэксту — р. 50 к. За радок шапіраму пасьпераду тэксту 1 р. — к. За радок шапіраму перад тэкстам 1 р. 50 к. Сьцешныя на 50 проц. даражэй. Зьмы тарыфу бярэцца 10 проц. налогу.

ПЛАТА ЗА ПУБЛІКАЦЫІ: За 1 квадрат — 35 к. За кожны дадатковы — 15 к. Беспадробныя і чарнавікарыйцы за квадрат — 15 к. За кожны дадатковы — 5 к. Публікацыі ЗАГСаў—3 руб.

ПАДПІСКА ПРЫМАЕЦЦА ў канторы газеты, на ўсіх аддзяленьнях Беларускага Дзяржаўнага Выдавецтва і ў іншых пасл.-тов. канторах. АБВЕСТКІ ПРЫМАЮЦЦА канторай газеты: Менск, рог Ленінскай і Карла Маркса (2-гі Дом Саветаў).

ПАДРЫХТОЎКА КАДРАЎ—ВАЖНЕЙШАЯ ЗАДАЧА.

Лістападаўскі пленум ЦК УсеКП(б) канстатаваў, што „недахват у кваліфікаваных тэхнічных і кіраўнічых кадрах, існаваўшы на працягу раду гадоў, асабліва абвастрыўся ў сучасны пэрыяд буйнага разгортваючайся прамысловасьці і сацыялістычнай перабудовы сельскай гаспадаркі". У нас, у БССР недахват кадраў спэцыялістаў в асаблівай вострасьцю адчуваецца ў сучасны момант, калі мы маем вялізарнейшыя тэмпы сацыялістычнага будаўніцтва.

Буйны рост прамысловасьці, вялізарнейшы рух калектыўнага будаўніцтва ў вёсцы рашуча ставяць пытаньне аб фарсыраваньні тэмпу падрыхтоўкі кваліфікаваных тэхнічных і кіраўнічых кадраў. Гэта актуальнае пытаньне сёньняшняга дню, на гэтым пытаньні надзвычайна шмат застанаўліваюцца ў сваіх прамовах члены Ўраду на Сэсіі Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР, якая ў сучасны момант адбываецца.

Актуальнасьць пытаньня падрыхтоўкі кадроў выплывае ня толькі з вялікага недахвату спэцыялістаў і кіраўнікоў для пашага гаспадарча-культурнага будаўніцтва, але і з таго, што якасьць часткі старых кадраў не адпавядае запатрабаваньням сучаснасьці, задачам сацыялістычнага перабудоўчага працэсу. У сучасны пэрыяд перабудовы ўсёй народнай гаспадаркі на сацыялістычны лад патрэбны спэцыялісты ня толькі з глыбокімі тэхнічнымі спэцыяльнымі ведамі, але і адданыя справе сацыялістычнага будаўніцтва. Гэта разумеюць і самі часныя, добрасумленныя спэцыялісты і навуковыя працаўнікі, адмяжоўваючыся ад шкодніку, рэакцыянэраў, нацыянал-дэмакратаў і г. д.

Пытаньне падрыхтоўкі кваліфікаваных тэхнічных і кіраўнічых кадраў вялікае і складанае. На вырашэньні гэтага пытаньня павінна быць згуртавана максымум энэргіі і ўвагі. У выкананьне пастановы пленуму ЦК УсеКП нашымі дырэктыўнымі органамі ўжо прымаецца шэраг мер, каб тэмп падрыхтоўкі кадраў прывесьці ў адпаведнасьць з тэмпамі сацыялістычнага будаўніцтва. Мы сёньня толькі застановімся на некаторых «дробязях», якія перашкаджаюць вырашэньню праблемы падрыхтоўкі кадраў і якія магчыма і патрэбна як мага хутчэй ліквідаваць.

Першае, што трэба адзначыць—гэта недагаворанасьць паміж НКА і адпаведнымі гаспадарчымі органамі аб тым, якіх і колькі патрэбна рыхтаваць спэцыялістаў для тэй ці іншай галіны гаспадаркі. Гэтае пытаньне павінна быць тэрмінова вырашана. Наркамзем, ВСНГ і іншыя гаспадарчыя органы павінны даць дакладныя весткі НКА аб патрэбнай колькасьці спэцыялістаў, бо інакш нельга разгортваць сетку навучальных установаў, нельга будаваць навучальныя пляны і праграмы. НКА трэба тэрмінова пераглядзець праграмы і навучальныя пляны ВНУ і тэхнікумаў у адпаведнасьці запатрабаваньням рэканструкцыі народнае гаспадаркі. Між іншым гэта праца праводзіцца вельмі марудна.

Другое пытаньне—гэта забясьпечаньне студэнцтва. Трэба адзначыць, што ўрад прымае ўсе магчымыя меры к таму, каб палепшыць матар'яльнае становішча студэнцтва. З кожным годам павялічваецца колькасьць стыпэндый і іх разьмер. Але з прычыны неўважлівых адносін каапэратыўных органаў да пытаньня харчаваньня студэнцтва ў гэтых адносінах справа абстаіць дрэнна. Такія весткі ёсьць з Горацкай сельска-гаспадарчай акадэміі, Мсьціслаўскага пэдтэхнікуму і шэрагу іншых месц. Каапэрацыйныя органы павінны наладзіць належным чынам харчаваньне студэнцтва.

Трэцьцяе пытаньне—гэта выхаваўчая праца сярод студэнцтва. Гэта галіна працы патрабуе валізарнейшай увагі, бо ёсьць выпадкі антысэмітызму (Полацкі пэдтэхнікум), ёсьць выпадкі выяўленьня нацыянал-дэмакратызму, нацыянальнай абмяжаванасьці і іншых варожых ідэалёгаў сярод студэнцтва.

Урэшце павінна быць асабліва завострана ўвага на падрыхтоўцы рабочых і бяднейшага сялянства ў ВНУ, тым болей, што паша сыстэма народнае асьветы ня можа даць патрэбнай колькасьці кадраў для паступленьня ў ВНУ.

2-гі ўсебеларускі зьезд працоўных латышоў

Учора ўвечары ў залі пасяджэньняў ЦВК адчыніўся 2-гі ўсебеларускі зьезд працоўных латышоў. На зьезд прыбыло 105 дэлегатаў.

На першым пасяджэньні з вялікім дакладам аб унутраным і міжнародным становішчы Савецкага Саюзу выступіў старшыня СНК БССР т. **Галадзед М. М.** Зьезд віталі прадстаўнікі цэлага шэрагу арганізацый і калгасаў: латсэкцыі ЦК УсеКП(б) і рэдактар латыскай сялянскай газэты т. **Ёкум**, ад латсэкцыі ЦК УсеЛКСМ тав. **Сандар**, латыскай рабочай газэты ў Маскве „Крэвіяс Ціня" т. **Ласіс**, латсэкцыі абкому заходняй акругі т. **Лаўкман**, латыскага калгасу на Клімаўшчыне т. **Ямбург** (жанчына), яўрэйскага калгасу т. **Абрамовіч**, ад саюзу сельгаслесрабочых т. **Башмачнікаў**. Былі таксама прывітаньні ад працоўнага насельніцтва, ад менскіх чыгуначнікаў.

Пад шумныя воплескі зьезду т. **Думс** зачытаў атрыманую прывітальную тэлеграму ад латыскай камуністычнай партыі.

Зьезд пастанавіў паслаць прывітаньні ЦК УсеКП(б), ЦК КП(б)Б, ураду БССР, Далёка-Усходняй Чырвонай арміі, латыскай камуністычнай партыі.

Сёньня зьезд заслухае даклад т. **Каркліна** аб шляхох разьвіцьця нашае сельскае гаспадаркі.

АДКРЫТЫ ЛІСТ ЗІНОЎЕВА.

Тав. ЗІНОЎЕЎ ПРЫЗНАЕ СВАЕ ПАМЫЛКІ.

МАСКВА. 24-га лістапада «Правда» апублікавала ліст Зіноўева, у якім ён піша: „Я ўжо даўно лічу, што партыя яе мелі поўную рацыю па ўсіх тых пытаньнях, па якіх апазіцыя выступала супроць ЦК. У прыватнасьці, у пытаньнях аб магчымасьцях будаўніцтва сацыялізму ў нашай краіне, у сялянскім пытаньні, у пытаньні аб трацкізьме, фракцыйнай барацьбе ўнутры партыі.

Другое. Тое-ж адносіцца і да правільнай пастаноўкі Цэнтральным Камітэтам нашай партыі пытаньня аб індустрыялізацыі ў процілегласьць разьбітай жыцьцём трацкісцкай „звыш"-індустрыялізацыі. Утоежсамліваць памылкі Бухарына з лініяй ЦК у 1925-27 гадох было няправільным тагды, няправільна і цяпер. Я ня лічу, што якія ня былі-б памылкі Бухарына апраўдваюць маю яўна няправільную барацьбу супроць ЦК у 1925 27 гадох і вельмі шкадую, што недакладнай фармулёўкаю прамовы на партыправерцы даў магчымасьць так зразумець мяне.

Шкоднасьць маёй барацьбы супроць ЦК партыі бачу і прызнаю поўнасьцю, бо лінія ЦК была і застаецца правільнай, ленінскай. Усе нашы западозраньні ЦК „у пераражэньні", „спазненьні", „цэнтралізьме" і спрыяньні правым былі ў аснове няправільнымі. Барацьба ЦК на два фронты была і і застаецца правільнай.

Я бачу цяпер і прызнаю гэта адкрыта, што ў пытаньні аб гутарцы Каменева з Бухарыным у ліпені 1928 году заўвага, зробленая нам Цэнтральным Камітэтам, была правільнаю. Тым больш бясспрэчна для мяне, што галоўным абавязкам кожнага бальшавіка зьяўляецца абсалютнае безагаворачнае правядзеньне палітыкі ЦК зараз ва ўмовах самых буйных посьпехаў сацыялістычнага будаўніцтва, абвастрэньня клясавай барацьбы, надыходзячых буйных боек і вялікіх перашкод. З свайго боку я жадаю толькі аднаго: каб таварышы ўпэўніліся, што я з партыяй ізноў зьліўся і адчуваю сябе цалкам і абсалютна з ёю салідарным ва ўсім".

ЗАЦІКАЎЛЕНАСЬЦЬ ДЗЕЛАВЫХ КОЛАЎ.

ЛЁНДАН, 21-11. На абвяшчэньне дэпартаманту замежнага гандлю аб тым, што нованазначаны ангельскі пасол Овій ў Маскве хацеў-бы пагутарыць з прадстаўнікамі ангельскіх гандлёвых і прамысловых колаў па пытаньнях савецкага рынку, адгукнулася шмат прадстаўнікоў гандлю і прамысловасьці.

Пасол увесь дзень прымаў прадстаўнікоў дзелавых колаў і абмяркоўваў з імі пытаньні англа-савецкага гандлю. З усіх канцоў краіны прысылаюцца заявы з просьбаю аб прыёме і аб інфармацыі. Друк падкрэсьлівае, што пасла наведваюць толькі дзелавыя людзі.

Супольная прапанова аб недавер'і ўраду Сьвітальскага.

ВАРШАВА, 23-11. На супольным пасяджэньні камуністычнае фракцыі і сойму, аб'яднанага сельробу, Беларускага рабоча-сялянскага клюбу і сялянскай партыі «самадапамога» (група Вайтовіча) ухвалена падаць у сойм супольную прапанову з выказам недавер'я ўраду Сьвітальскага.

Масавыя арышты ў Варшаве.

ВАРШАВА, 23-11. Пасьля дэманстрацыі камсамолу ў Варшаве ў адзнаку 10-х угодак КІМ'у учынены масавыя вобыскі і арышты сярод моладзі. За мінулую ноч учынена 42 вобыскі і арыштавана 50 чал.

Друк паведамляе, нібыта ў рукі паліцыі трапілі сябры ЦК кампартыі.

ДРУГАЯ СЭСІЯ ЦВК БССР

РУХ КАЛЕКТЫВІЗАЦЫІ У КЛІМАЎШЧЫНЕ.

САДАКЛАД СТАРШЫНІ КЛІМАВІЦКАГА РВК тав. ТАРАСЕНКА ПА ДАКЛАДУ т. РАЧЫЦКАГА.

ШТО У НАС БЫЛО.

Клімавіцкі раён адзін з вялікіх раёнаў па сваёй тэрыторыі, а таксама і насельніцтва. Земляўпарадкаваньне было праведзена да 1929 г. на 48,8 проц. З іх былі хутары складзеныя пры Сталыпіне 7,8 проц. і пры савецкай уладзе 9,2 проц., пасёлкаў 31,8 проц. Калгасы да 1929 г. на Клімаўшчыне большасьцю былі арганізаваны на былых абшарніцкіх землях. Усяго было 16 калгасаў, што складала да 2 проц. ўсёй плошчы. Гэта былі таварыства па сумеснай апрацоўцы зямлі. Яскравага прыкладу для далейшай калектывізацыі гэтыя таварыствы не маглі даць.

Калі у вясеньную пасеўную кампанію 1929 г. пачалі разгортваць калектывізацыю, то т-вы зьяўляліся да некаторай ступені тормазам у нашай працы, бо ў некаторых выпадках яны займаліся ў сваім жыцьці ня тым, каб палепшыць калектывы.

ПЕРШЫ ВОЛЫТ.

Вясновы плян сельска-гаспадарчай кампаніі 1929 году мы склалі таксама прыкладна, як складалі і папярэднія пляны да 1929 г. Па нашаму пляну было прыкладна намечана арганізаваць да 10 калгасаў і толькі пасьля дадзеных дырэктыў партыйным і савецкім зьездамі, асабліва калі на XII зьезьдзе КП(б)Б было завострана пытаньне аб неабходнасьці зрабіць рашучы пералом у калектывізацыі нашай сельскай гаспадаркі ў бок стварэньня буйных калгасаў, перад нашымі партыйнымі арганізацыямі і савецкімі органамі паўстала пытаньне, каб аб'яднаць цэлыя вёскі і нават некалькі вёсак у адзін калгас.

У першую чаргу мы ўзяліся за абмеркаваньне, дзе ж пачаць, дзе ж знайсьці такія вёскі, якія-б адпавядалі некаторым момантам суцэльнай калектывізацыі.

І ў выніку мы ўзялі адну вёску з раёну—Дубровіцу, Дубровецкага сельскага савету. Там мы мелі даволі моцную партыйную ячэйку, здавальняючую працу сельсавету, мелі некаторы вясковы актыў, актыў бедноты, культурныя ўмовы, як: хата-чытальня, мэдычны пункт і каапэрацыя.

Перш за ўсё пачалі працу з Дубровецкай партыйнай ячэйкі.

Потым ужо пачалі весьці працу сярод беспартыйнай часткі сялянскага актыву, у першую чаргу сярод беднаты. Тут мы сустрэліся з поўнай няпісьменнасьцю ў гэтых адносінах.

Калі мы беднату падрыхтавалі, прапрацаваўшы з ёю ўсе гэтыя пытаньні, мы ўзяліся за сялянскі актыў.

Мы там яшчэ сустрэліся з даволі цьвёрдаю сьцяной—жанчынай, якая асабліва баіцца ісьці ў калгас, якая баіцца пакінуць свой лён, а самае галоўнае, яна ставіць пытаньне, ці дадуць ёй там лён, ці дадуць ёй малака і г. д.

Жанчына прадстаўляла сабою цьвёрдую сьцяну, якую трэба было перамагчы, трэба было яе зьвярнуць у бок калектывізацыі, для чаго прышлося шмат працаваць і гэтага мы дабіліся.

Мы растлумачылі ім значэньне калгасу, як яны там будуць жыць, як будуць працаваць і г. д.

І толькі пасьля гэтага мы склікалі агульны сход гэтай вёскі, на якім паставілі пытаньне аб арганізацыі цэльнай вёскі ў адзін калгас.

КУЛАКІ ІМКНУЛІСЯ ПЕРАШКАДЖАЦЬ.

Тут зразумела паказаў свой твар і кулак, ён пачаў праводзіць усе свае манэўры, каб неяк затармазіць калгаснае будаўніцтва. Асноўнае, што кулак рабіў, гэта запугваньне бедняка тым, што ў бедняка забіраюць каня і зямлю, што ён будзе толькі парабкам у калектыве. Але паколькі мы падрыхтавалі ўжо беднату, вясковы актыў жанчын, дык нам гэтыя выступленьні з боку кулакоў былі ўжо ня так небясьпечны. Мы ўжо мелі выступленьні паасобных актыўных беднякоў, якія рашуча змагаліся за каляктыў і самі давалі адпор кулакам. Калі мы адчынілі запіс, дык у першую чаргу запісаліся, зразумела, члены партыі, а за імі падрыхтаваны намі актыў, і нарэшце мы стварылі калгас у які ўвайшла амаль што ўся вёска, за выключэньнем 5-6 кулакоў, 2-х беднякоў, якія засталіся на перапуцьці і якія былі ў залежнасьці ад кулака і 13 двароў (дзе былі заможныя, сераднякі і частка беднякоў), якія стварылі перасяленчаскую арцель для пераселеньня ў Сібір.

ПА ПРЫКЛАДУ ПЕРШАЙ ВЁСКІ

На гэтым сходзе, дзе быў арганізаваны калгас у Дубровіцах прысутнічалі некаторыя беднякі з суседняй вёскі.

Гэтая частка беднякоў увесь час цікавілася калгасным пытаньнем і рашула таксама арганізаваць у сябе каляктыў. Іхняя вёска даўно ўжо хацела правесьці земляўпарадкаваньне, але ім не ўдалося гэта зрабіць, бо заможная частка ўсялякімі спосабамі перашкаджала.

Гэтыя беднякі пайшлі ў сваю вёску, самі правялі там некаторую папярэднюю невялікую работу, абгаварылі ў сябе пытаньне аб магчымасьці арганізацыі калгасу і зьвярнуліся да нашых прадстаўнікоў, якія працавалі ў Дубровіцах на стварэньні калгасаў з просьбаю, каб яны прыехалі да іх. І калі мы задалі пытаньне гэтай дэлегацыі ці згодны яны далучыцца да Дубровіцкага калгасу, яны далі гэтую згоду.

Такім чынам, агонь быў перакінуты на суседнюю вёскуПапеханьку; там такім мэтадам была праведзена праца, і амаль што ўся гэтая вёска ўвайшла ў калгас, за выключэньнем кулакоў, якіх не прынялі.

Як у далейшым выявілася, што складаньне калгасу праходзіць лягчэй, чым замацаваньне яго. Замацаваньне калгасу асабліва у першыя арганізацыйныя дні—гэта асабліва цяжкая праца, і тут трэба пільна сачыць за кулаком і заможнікам, якія ўсякімі мерамі імкнуцца ўзарваць калгас. Трэба сказаць, што мы ў гэтым калгасе увесь час, што называецца, дзяжурылі і пільна сачылі за работаю ў калгасе.

ТАВ. ТАРАСЕНКА.

ДАПАМОГА РАБОЧЫХ.

У замацаваньні калгасаў дапамагалі рабочыя брыгады, якія зараз-жа пасьля стварэньня іх паставілі перад сабой пытаньне аб неабходнасьці аказаць яму магчымую дапамогу. Праўда, у Клімавічах рабочая праслойка не асабліва вялікая, але ўсёж-такі рабочыя сваімі сіламі, шляхам адлічэньняў некатораго процанту ад сваёй зарплаты, здолелі купіць гэтаму калгасу: 2 жнейкі, карнярэзку, пружынную барану і інш. дробязі. Сваім выездам у гэты калгас, самім працэсам перадачы гэтых падарункаў калгасьнікам, гэтай ненасрэднай практычнай змычкай рабочых і калгасьнікаў, быў падняты маральны настрой калгасьнікаў. Калгас упэўніўся, што яму ўсё-ж такі дапамагаюць ня толькі гутаркамі, але і на справе, памагаюць выйсьці яму з цяжкага эканамічнага становішча, і гэта падняла настрой і маральна замацавала калгас.

ДАЛІ АДПОР КУЛАЦТВУ.

Калі кулакі і заможнікі ўбачылі, што калгас канчаткова замацоўваецца, яны арганізоўвалі падпольныя сходы, ужывалі усякія запугваньня, розныя евангельскія разважаньні і гэтымі мэтадамі яны схілілі некалькі беднякоў і сераднякоў падаць заявы аб выхадзе з калгасу. І вось у адзін дзень раптам мы атрымоўваем 17 заяў ад беднякоў і сераднякоў аб выхадзе з калгасу.

Мы выявілі паасобных людзей, якія праводзілі гэту падрыўную працу. Яны зьбіралі падпольныя сходы, паставілі на агульным сходзе пытаньне аб выключэньні з калгасу 5 такіх заможнікаў. Сход выносіць пастанову выключыць іх, падняўшы хадайніцтва перасяліць іх у іншае месца на зямлі запаснага фонду.

У ПОШУКАХ ВОПЫТАЎ

Асабліва мы цяжка адчувалі сябе пры складаньні ўнутранага распарадку калгасу. Гэта-ж калгас, які мае 600 рабочых рук, што называецца добрая фабрыка, ім неабходна даць кожнаму работу і трэба, каб гэтая работа была продукцыйнай.

Прыкладу ў нас ня было нідзе. Нідзе ня было такіх плянаў унутранага распарадку. Калгассаюз не пасьпеў таксама ў гэтых адносінах што-небудзь падрыхтаваць і бюро раённага камітэту партыі прышлося ператварыцца ў калгассаюз, мы сядзелі і самі пісалі, выдумвалі, якім чынам пабудаваць унутраны распарадак. Усёж такі напісалі, якім карыстаемся і да гэтага часу.

Паміж іншым трэба адзначыць, што нам у гэтым напрамку дапамагала Горацкая Сел.-Гасп. Акадэмія шляхам прыезду прафэсароў на месцы, шляхам перагляду нашых плянаў. Яна абяцала нам таксама склады вытворчыя пляны, праўда яшчэ да гэтага часу ня склала, але яны абяцалі ў гэтую зіму даць гэты плян. І зараз, калі сустракаюцца якія-небудзь цяжкасьці ў нашай працы, то мы зварочваемся да Горацкай Сел.-Гасп. Акадэміі, якая нам дапамагае.

Я хачу спыніцца адносна абагуленьня сродак вытворчасьці. Асабліва цяжка было нам вырашыць пытаньне, як абагуліць сродкі вытворчасьці, або адразу абагуліць усе каровы і сьвіней, і авечак, або паступова. Мы ўзялі прынцып паступовага абагуленьня і ў першую чаргу мы абагулілі інвэнтар і рабочы скот.

Трэба было зрабіць ацэнку інвэнтару. Мы склалі даволі шырокую камісію па ацэнцы гэтага інвэнтару. І вось калі ўжо выехалі пахаць на поле, калі ўжо плуг зрабіў першую баразну калектыўна, калі беднота, якая цягнулася за сваім дрэнным конікам, з паломаным плугам і калі ён зараз запрог пару добрых коняй і пашоў за добрым плугам, то адразу зрабіўся поўны пераварот яго мазгоў. Тады ён зразумеў, што сапраўдна ўсё тое, што яму гаварылі, правільна, што сапраўдна ў калгасе можна жыць і працаваць лепей.

Цікава, наколькі трактар робіць сапраўдную рэвалюцыю на нашых палёх. Калі нам прыслалі першы трактар з балотнай станцыі Наркамзему і ён схапіў адразу цэлую палоску, то адна жанчына аж ускрыкнула „божа-ж мой, ён маю ўсю палоску схапіў і павёз" і толькі тады зразумеў селянін, што значыць трактар, што трактар можа даць.

ДАЛЕЙШАЕ РАЗГОРТВАНЬНЕ КАЛЕКТЫВІЗАЦЫІ.

Мы ўзялі напрамак на арганізацыю калгасаў у паасобных канцах нашага раёну. Там мы сустрэліся з актыўнай вылазкай заможнікаў. Яны арганізавалі амаль што цэлую арганізацыю і выкінулі лёзунг „Ні за што у калгасы". І што вы думаеце, прышлося біцца з гэтаю часткаю доўгі час.

У справе калектывізацыі асабліва нам дапамагаў калгас «Ленінскі Шлях», ён зьяўляўся прыкладным паказчыкам для ўсіх астатніх і ўсе тыя толькі і чуткі мы стараліся апраўрэгаць, пасылаючы туды экскурсію ня толькі з нашых раёнаў, але і з месц БССР. Прыходзілі экскурсіі за 300 вёрст паглядзець як сяляне праводзяць работу калектыўна.

Тут і разьбіваліся ўсе хлусьлівыя чуткі аб калектывах.

НЕ ДАПУСКАЦЬ КУЛАКОЎ, ПАВЯЛІЧЫЦЬ НЕДЗЯЛІМЫЯ КАПІТАЛЫ.

Вопыт гаворыць аб тым, што ні ў якім разе нельга прымаць кулака ў калгас. Ён стараецца знутры ўзарваць калгас. Мы прабавалі перасяляць іх з аднаго сельсавету ў другі на запасны зямельны фонд, а зараз такое становішча, што там дзе іх перасялілі стараецца калгас, а яны толькі засеялі, толькі перанесьлі свае будынкі, і раптам зноў трэба зносіць куды-небудзь в месца на месца. Канцэнтраваць кулакоў дзе-небудзь у адным месцы, адводзіць ім кавалак зямлі гэта таксама нямысьліма, бо гэта адзначае стварыць кулацкія гнёзды. Адзіная думка, што неабходна прыняць усе меры да таго, каб перасяліць іх дзе небудзь на паасобны калёнізацыйны фонд, на адзіночку, але на сёньняшні дзень ёсьць досыць многа кулакоў, якіх мы ня можам прыняць у калгасы, якіх прыдзецца выключыць, а дзяваць іх некуды. У нас пакуль што на сёньняшні дзень няма ніякіх дырэктыў, паказаньняў, мы пакуль даем ім паасобныя вучасткі ў розных бакох каляктыву, у кожным полі па аднаму кавалку для засева, але гэта-ж нас не ўстрайвае ў далейшым, гэта-ж толькі часовыя меры.

У нас у зьвязку з калектывізацыяй наглядаюцца досыць нездаровыя моманты — гэта распродаж маемасьці. Асабліва гэта робіць кулак: калі ён адчувае, што яго абложаць індывідуальна, то ён пачынае прадаваць жывёлу, і калі не многа, то збывае па колькасьці і набывае лепшую па якасьці.

Да гэтага ўжо прыняты меры, але ўсётакі неабходна гэтыя моманты прадугледзець, каб у далейшай рабоце калектывізацыі гэтых выпадкаў ня было. Прадаваць зараз салому—азначае вясной застацца без навозу. Мы ўзялі на вучот усю салому ў кожным калгасе, усю жывёліну і бяз ведама праўленьня калгасу ніхто ня мае права прадаваць.

Маецца вельмі цікавы момант у тым, што служыцелі культа пастаянна стараюцца тармазіць у рабоце. Яны зараз адчуваюць, што далей ім ісьці некуды. І яны складаюць з сябе сан, просяцца ісьці ў калектыў.

Далей я хачу спыніцца на тым, што некаторыя гавораць, што ў нашых раёнах маюцца якія-тэ асаблівасьці. Абсьледваньнем камісіі, якая вылучана Акрвыканкомам, устаноўлена, што ніякіх асаблівасьцяй няма і што ў нас маюцца такія вынікі, дзякуючы цьвёрдага напору пры арганізацыі першага калгасу, які мы паставілі прыкладам, узорам для ўсіх астатніх калгасаў.

„ПРЫШЧЭПАЎШЧЫНА" ПЕРАШКАДЖАЛА.

Пры калектывізацыі мы сустрэліся з непаразуменьнямі па зямельным кодэксе, як з мінімальнымі, так і максымальнымі нормамі і з тым, што на сёньняшні дзень яшчэ няма яскравых паказчыкаў.

Далей досыць дрэнна абстаіць пытаньне з нашым статутам сельска-гаспадарчых арцеляй. Там пай устанаўляецца для ўсіх аднолькавы, і для беднякоў і для сераднякоў і для заможных. Дыфэрэнцыацыю пая ў нас падтрымлівалі ня толькі беднота, але і сераднякі і такім чынам у нас праведзен дыфэрэнцыраваны пай у Асмолавіцкім с-савеце, дзе беднякі плоцяць пай меш за сераднякоў, больш заможныя плоцяць больш.

Гэты момант трэба будзе ў далейшым як мага хутчэй выправіць, каб яго ня было.

Збор пасеннага фонду ўстанаўляецца па паёх. Бядняк ці серадняк, хто бы там ні быў, павінен уносіць пасенны фонд. Бедняк мае два паі, а можа і тры; яму трэба ўносіць 15 пудоў, а заможны, які мае можа быць два паі уносіць толькі 10 пудоў. Зусім ненармальнае было зьявішча. У нас гэтыя ненармальнасьці зараз зьнішчаны і мы зараз бярэм пасенны фонд з пасеўнай дзесяцінай зямлі.

У далейшым неабходна кадры і матар'яльная дапамога.

ТРЭБА РАСШЫРЫЦЬ ПРАМЫСЛОВАСЬЦЬ І ЭЛЕКТРАФІКАЦЫЮ.

Вы ведаеце, што ў нас па Клімаўшчыне слабая рабочая праслойка, а бяз прамысловасьці мы ня можам будаваць калектыўнае жыцьцё і ня можам думаць, што калгасы будуць разьвівацца. Трэба падумаць аб пабудове якой-небудзь прамысловасьці ў нашым раёне. У нас жа за выключэньнем аднаго толькі сілікатнага заводу з 29 рабочымі і 3—4 вінакурных заводаў няма больш ніякай прамысловасьці. У нас бульбяны раён, трэба пабудаваць у нас крахмальны завод, іншыя заводы. Я вось прывяду прыклад: у нас на Беларусі намечана пабудаваць 1 агра-камбінат, куды будуць укладзены вялікія сродкі. На сёньнешні дзень у нас у Клімавіцкім раёне сельская гаспадарка калектывізавана на 80 пр., у Хоцімскім на 50 проц., у Касьцюковіцкім—на 30 проц., у Чэрыкаўскім—да 50 проц., у Крычаўскім раёне—да 40 проц. Вось вы бачыце цэльную плошчу, 4 раёны, дзе падыходзіць да канца сплашная калектывізацыя. Ці немэтазгодна было-б пабудаваць гэты агра-камбінат на гэтай тэрыторыі?

Трэба прызадумацца, пагаварыць, даць тую-сюю дапамогу. Яшчэ раз падкрэсьліваю, што бяз прамысловасьці гэтая калектывізацыя немагчыма. Трэба замацаваць калектывы, іх можна замацаваць ня толькі гутаркамі і рэзалюцыямі, а канкрэтнай дапамогаю.

Возьмем другі прыклад: у нас зараз вялікі настрой электрафікаваць райён; паасобныя пашы калгасы зьбіраюць шляхам самаабкладаньня сродкі і праводзяць электрафікацыю. І вось зараз у Крычаве будуецца досыць моцная электрастанцыя, якам будзе працаваць на Клімавічскім торфе. Я ня стаўлю зараз пытаньня, ці мэтазгодна гэтую станцыю будаваць у Клімавічах ці ў Крычаве, але я кажу, што калі нам будзе малавата энэргіі, дык трэба павялічыць моцнасьць гэтай станцыі, каб яна магла даць энэргію і нашым калгасам. Мы будзем будаваць свае калгасы з такім разьлікам, што яны будуць аб'яднацца толькі у 7 кустоў на усяму раёну. Трэба да гэтых кустоў прыстасаваць і школы і ветэрынарныя пункты і нарадмы, трэба гэтыя пункты зьвязаць хоць бы тэлефонамі, а то у нас на увесь раён з 22 сельсаветаў толькі 5 с-с зьвязаны тэлефонамі. Ці-ж можна гаварыць аб дастатковым кіраўніцтве пры такіх умовах? Ня можна. Нельга на 2-х конях рэгулярна аб'яжджаць усе с-саветы і калгасы хаця-б на працягу месяца. Гэта трэба будзе улічыць і даць нам поўную дапамогу.

Далей, аб трактарах. Трэба нам даць трактарную калёну, з разьліку па 80 тыс. гектараў; каб пададзіць правільную апрацоўку зямлі нам трэба даць мінімум 60 трактароў: колькі нам дадуць—ня ведаем, але на сёньняшні дзень у нас на палёх гэтых калгасаў працуе 2 трактары.

Прыклад калектывізацыі у Клімавіцкім раёне капчаткова б'е па тых ныціках, якія яшчэ да сёньняшняга часу думаюць, што ва умовах Беларусі калектывізацыі ня можа быць. Факты разьбіваюць да ичэнту палітыку правых апартуністых, факты гавораць за тое, што толькі праз калектывізацыю можна вывесьці бедняка і сераднякa з яго цяжкага становішча і павесьці іх на сацыялістычнаму шляху.

ДЗЕНЬНІК СЭСІІ ЦВК БССР

(Пасяджэньне 24 лістапада 1929 г.).

На ранішнім пасяджэньні адбыліся спрэчкі па дакладу аб дзяржаўным бюджэце БССР на 1929-30 г.

У спрэчках выказаліся т. т. Булгак, Мацієўская, Нахільніцкі, Ласкін, Быкава, Фаміна, Стракоўскі, Гудзян, Шчэрбінская, Вінаградаў, Нікіціна, Шэхтман, Герасіменка, Іванова, Федзюк, Барсукоў (Мазыршчына), Патапенка, Падольскі, Жарын, Пятроўская, Палозьнік.

Пасьля сканчэньня спрэчак выступіў з заключным словам т. Мікуліч. Сэсія ЦВК пастанавіла даручыць бюджэтнай камісіі ЦВК распрацаваць праэкт рэзалюцыі па дакладу аб дзяржаўным бюджэце БССР на 1929-30 г.

Сэсія ЦВК паслала прывітальную тэлеграму Далёка-Ўсходняй Асобнай Чырвонай арміі.

Камандуючаму Далёка-Ўсходняй Асобнай арміі тав. Блюхеру.

Другая Сэсія ЦВК БССР горача вітае байцоў і камандна-палітычны склад Далёка-Ўсходняй арміі ад імя рабочых і сялян Савецкай Беларусі.

Працоўныя Савецкай Беларусі добра разумеюць, што ўсялякая небясьпека на Ўсходзе Савецкага Саюзу шчыльна зьвязана з небясьпекай на Захадзе і таму пільна сочаць за падзеямі на Далёкім Усходзе дзеля таго, каб у кожную хвіліну дапамагчы чырвоным байцам Далёка-Ўсходняй Чырвонай арміі.

Байцы Далёка-Ўсходняй Арміі! Моцна стойце на варце межаў Савецкага Саюзу і будзьце ўпэўнены, што кожны з працоўных Савецкай Беларусі, як і ўсяго Савецкага Саюзу, заўжды гатовы на дапамогу Вам.

Няхай жыве Савецкі Саюз.

Няхай жыве Чырвоная армія!

Старшыня Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР А. Чарвякоў

Сакратар Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР А. Хацкевіч.

24 лістапада 1929 г. гор. Менск.

Да Сэсіі ЦВК БССР.

Ранішняе пасяджэньне Сэсіі ЦВК БССР пачынаецца з 10 гадз.

Парадак дню: а) Даклад аб чыстцы савецкага апарату. Дакладчык тав. Рыськін; б) спрэчкі па дакладу.

Вачэрняе пасяджэньне—з 6 гадзін.

Парадак дню: а) спрэчкі і заключнае слова па дакладу аб чыстцы савецкага апарату; б) інфармацыйны даклад аб сельска-гаспадарчай выстаўцы. Дакладчык тав. Дубіна і в) інфармацыйны даклад аб рэарганізацыі Віцебскай акругі. Дакладчык т. Конанаў.

Сакратар ЦВК БССР А. ХАЦКЕВІЧ.

Другая Сэсія ЦВК БССР

Спрэчкі па дакладу тав. Рачыцкага і садакладу тав. Тарасенка.

КАЛГАСЫ—ФАКТАР ПЕРАБУДОВЫ БЫТУ.

Прамова т. Соскіна.

На працягу апошніх двух год дружна, напружана працаваў увесь актыў Клімавіцкага райёну па выкананьню дырэктыў партыі і ўраду.

Па сялянскому займу ў нас быў розыгрыш, дзякуючы таму, што мы досыць стала правялі гэту працу. Хлебазагатоўчую кампанію мы першыя пачалі праводзіць чырвонымі абозамі; пры перавыбарах саветаў да 70 проц. удзельнічала беднящка-серадняцкіх колаў і рабочых на выбарчых вучастках. Усё гэта рабілася дзякуючы напружанай працы і падрыхтаванасьці беднящкай масы.

У нас ёсьць вялізарнейшыя дасягненьні ў справе калектывізацыі, дзякуючы таму, што напружана ўзяліся за гэту справу і падрыхтоўвалі наступова асноўныя масы сялянства.

Сялянства верыць, калі яно ў сапраўднасьці бачыць тыя дасягненьні, якія маюцца. Прыходзілі дэлегацыі з усіх с-с нашага райёну, з ўсіх райёнаў Магілеўшчыны, якія акружаюць „Ленінскі Шлях". Дэлегацыі прыходзілі за 200 вёрст пяшком па два разы, каб пераканацца, як жыве „Ленінскі Шлях".

Калі мы прыступалі да арганізацыі новых калгасаў, мы сустракаліся з цэлым шэрагам супярэчнасьцяў з боку кулакоў. Калгасы стваральная ва ўмовах жорсткай клясавай барацьбы.

У мяне ёсьць цэлы шэраг копій запісак, якія падкідваюцца нашаму актыву з боку кулацкай часткі вёскі, якое рабіць падпалы, забойствы.

Партарганізацыя стаяла пачале калектывізацыі і мы маем 80 проц. калектывізаванай плошчы. Больш 1.000 хутароў і старых і новых зьнішчана. Руйнуюцца ня толькі старыя хутары, але ўсё старое. У большасьці пэркваў Клімавіцкага райёну кінулі маліцца, бо калгасьнікі адмовіліся плаціць папам і папы таму стрэгуцца і ідуць у калгас. У нас цэлы ворах заяў папоў, рабінаў, якія адмаўляюцца пад напорам энтузіязму мас ад сана.

Яскрава, што рэканструкцыя сельскай гаспадаркі, калектывізацыя зяўляюцца важнейшым фактарам пераходу і ў быту ня на новы сацыялістычны лад.

Нашы беднящка-серадняцкія масы ў калгасах усвоілі ўстаноўку нашай партыі у тым, што трэба таней будаваць нашы калгасы.

АХОВА ЗДАРОЎЯ НА ДАПАМОГУ КАЛЕКТЫВІЗАЦЫІ.

Прамова т. Барсукова.

Пры будаўніцтве сацыялістычнага сэктару народнае гаспадаркі на вёсцы трэба памятаць і аб ахове здароўя. У першую чаргу трэба арганізаваць абслугоўваньне сацыялістычнага сэктару, які зараз разьвіваецца ў нас на беларускай вёсцы. У нас ствараюцца калгасы і як бы ні былі паказальныя нашы калгасы і савгасы ў эканамічных адносінах, гэта будзе недастатковым, калі ня ўлічыць у іх элемэнтаў аздараўленьня працы і быту.

Апошні пленум ЦК КПБ упаўне правільна адзначаў калі вынес пастанову НК Аховы Здароўя і калгасаюзу распрацаваць цэлы шэраг мерапрыемстваў па лепшаму абслугоўваньню калгасаў і савгасаў лекавымі ўстановамі. Калгас павінен стаяць на першым месцы ў культурным абслугоўваньні нашай вёскі і ў пытаньнях аховы здароўя. Барацьба за лазьні, за добрую чыстую хату зьяўляецца перадавой задачай сёняшняга дню. Мы павінны рашуча паставіць пытаньне перад нашымі органамі аховы здароўя на большае пашырэньне жыльлёвага будаўніцтва ў калгасах і савгасах, і сачыць рашуча за санітарным становішчам. Нам трэба падбіраць добрыя месны для пабудовы жыльлёвых будынкаў. Пытаньне аб пабудове ясьлей стаіць перад нашай жанчынай і яго неабходна разьвіць асабліва ў калгасах і савгасах. У гэтым годзе мы маркуем адчыніць 500 ясьляў, якія ахопяць 10000 дзяцей. Неабходна зьвярнуць належную ўвагу на фізкультуру, паслаць фізкультурных работнікаў у першую чаргу ў калгасы і савгасы.

У сучасны момант, калі ў нас мала мэдычных пунктаў, трэба, каб тыя мэдычныя ўстановы, якія існуюць па раёнах, былі прыстасаваны для абслугоўваньня калгасаў і савгасаў.

Зразумела, пры тых сродках, якія адпушчае нам дзяржава, мы ніколі ня зможам выканаць тых задач, якія паўстануць перад намі пры калектывізацыі сплашной. Пры дапамозе саміх калектыўаў мы зможам гэтае пытаньне вырашыць. Трэба стварыць фонды самымі калгасамі на тое, каб мець магчымасьць якога-небудзь калгасьніка паслаць на курорт, адчыніць ясьлі, ці лазьню.

ПАТРЭБНЫ КАДРЫ ПРАЦАЎНІКОЎ І ТРАКТАРЫ.

Прамова тав. Лоцманава.

Тут таварышы ўжо выступалі і гаварылі аб колектывізацыі. Я таксама хачу спыніцца на некаторых момантах, калі месцы ўжо ўсьвядомілі дырэктывы XII зьезду партыі і наогул дырэктывы нашага ўраду адносна колектывізацыі, праявілі многа ініцыятывы, то нашы паасобныя органы, нават цэнтральныя, у гэтым напрамку недастаткова яшчэ гібкія і гэта адчуваецца на мясцох.

Зараз сур'ёзна ставіцца пытаньне аб кадрах. НК Асьветы адчыніў Канінскі тэхнікум калектыўнага земляробства. На яго неабходна зьвярнуць асабліву ўвагу ў сэнсе матар'яльнага забясьпечаньня. Па сацыяльнаму складу падобраны выключна рабочыя, батракі. Калі адміністрацыя гэтага тэхнікуму зьвяртаецца да НК Асьветы з дапамогаю, то там бюракратычна адказваюць, што гэта пытаньне ня вывучана, мы ня ведаем дзе гэты тэхнікум будзе існаваць і г. д.

Калі НК асьветы будзе так ставіць пытаньне аб кадрах, то мы будзем вывучаць у працягу 5 год, але пытаньня аб кадрах ня вырашым. Я лічу, што пытаньне аб нашым тэхнікуме калектыўнага земляробства па падрыхтоўцы кіраўнікоў для савгасаў зьяўляецца надзвычайна сур'ёзным і яго трэба вырашыць у тэрміновым парадку.

Тав. Рачыцкі ў сваім дакладзе высунуў думку аб тым, што нашу Беларусь неабходна калектывізаваць за 2-3 гады. Я лічу, што за гэты тэрмін бязумоўна калектывізаваць магчыма.

Апошняе, над чым я хачу спыніцца, гэта на разьмеркаваньні трактараў. Калі я не памыляюся ў гэтым годзе мы атрымоўваем з 40 тысяч трактароў усяго 325 трактароў. Я лічу, што БССР павінна з гэтых 40 тысяч трактароў атрымаць хаця-б процантаў 4, што складае прыблізна 1600 трактароў.

Наш урад павінен на гэта зьвярнуць асаблівую ўвагу.

НЕ ЗАБЫВАЦЬ ПРА ЖЫВЁЛАГАДОЎЛЮ.

Прамова т. Цітова.

Мы ўважліва заслухалі даклад НКЗема і садаклад старшыні Клімавіцкага РВК. Мы, бязумоўна, можам адзначыць, што ў нас ёсьць дасягненьні ў галіне калектывізацыі. Адзначаючы гэтыя дасягненьні, мы ніколі не павінны забываць аб нашых недахватах.

Часта сяляне, якія хочуць увайсьці ў калектыў, уваходзяць туды толькі з адной каровай і адным канём, а ўсю астатнюю сваю жывёлу прадаюць. Гэта, зразумела, самае ненармальнае зьявішча ў нашай рабоце. У нас арганізуюцца часта вельмі дробныя калектывы. Я бачыў адну вёску, дзе мелася каля 100 двароў, а там стварыўся калектыў толькі з 6 двароў. Да пытаньня кіраўніцтва калгасамі трэба падыходзіць больш уважліва, каб калектывы мелі ўпльў на ваколічнае сялянства.

Далей, адна заўвага наконт нашага жывёлаводзтва. Гэта праблема вялікая. Мы маем на сёньняшні дзень шмат сыраварных заводаў. Мне прыходзіцца часта бываць на адным заводзе і вось я заўважыў такое зьявішча, што прыліў малака найбольш вялікі—да 170 вёдзер бывае ў летнія часы, а калі толькі наступаюць кастрычнікавыя сьвяты, дык на завод паступае ўсяго толькі 18 літраў малака. І справа вось у чым. Звычайна мы маем канцэнтраваныя кармы беднаце і гэта зусім правільна, але выходзіць так, што ў бедняка маецца толькі адна карова, ён рад-бы панесьці малако ў таварыства, але ў яго няма. А серадняцкія гаспадаркі ставяць так пытаньне: „Нам нічога не даюць, дык і мы нічога не дадзім". Трэба гэта пытаньне вырашыць.

УЗМАЦНІЦЬ НІЗАВЫЯ САВЕЦКІЯ ОРГАНЫ ПРАЦАЎНІКАМІ.

Прамова т. Асмалоўскага.

Шпаркі рост калектывізацыі вёскі прымушае нас яшчэ больш увагі зьвярнуць на клясавую барацьбу на вёсцы. У гэтых адносінах вялікую ролю павінны адыграць сельсаветы і КСТУ. Нам трэба будзе разумаць аб тым, каб скалаціць кадры і падрыхтаваць працаўнікоў у с.-с. У надыходзячыя перавыбары саветаў трэба будзе стварыць курсы для нізавых працаўнікоў на мясцох, каб узмацніць нізавы сельсавецкі актыў, бо калі с.-с. слаба працуе, тады ў гэтай мясцовасьці цяжка і калгасы стварыць.

Другое пытаньне—гэта аб Сялянскіх Камітэтах Узаемадапамогі, якія павінны згуртаваць навакол сябе беднату. Камітэты сялянскай узаемадапамогі не зьяўляюцца такімі кіраўнікамі, такімі арганізатарамі беднаты.

Зараз я хацеў-бы спыніцца на памылках, якія маюцца пры арганізацыі колектыўных гаспадарак. Па пастанове вышэйшых органаў было вызначана, каб правесьці агульнае землеўпарадкаваньне ў райёнах, дзе асабліва разьвіта ільнаводзтва. Агульнае землеўпарадкаваньне гэтых райёнаў затармазіла рост калектывізацыі.

Ня трэба зараз ісьці па лініі землеўпарадкаваньня тэй альбо іншай вёскі, а трэба зараз землеўпарадкаваць нашыя калгасы.

Тав. Сьмірноў тут выступаў і гаварыў аб тым, што мы ня можам шырока праводзіць машынізацыю. Ён гаворыць: трактара мы зараз ня можам даць, як і складаных машын, трэба прыменяць нашы сучасныя сродкі—плуг і каня. Але усё-ж такі мы павінны ставіць і сёньня пытаньне аб тым, што нам патрэбны складаныя машыны, што нам патрэбен трактар.

Другое пытаньне—гэта абслугоўваньне калгасаў тэхнічнымі працаўнікамі агрономамі. Трэба сказаць, у нас няма належных кадраў, няма каго прымацаваць да к-ву. Калі ёсьць тры агранома на 89.000 дзес. зямлі, то ці могуць яны абслужыць?. Ні ў якім разе ня могуць. На гэтую галіну трэба зьвярнуць асабліву ўвагу, каб мы змаглі замацаваць нашыя колектыўныя гаспадаркі.

Я лічу, што зараз неабходна ўзмацніць сельсаветы і райвыканкомы працаўнікамі, выходзячы з тых задач, якія ставяцца перад гэтымі органамі Акрвыканкомам і цэнтральным ўстановам трэба паклапаціцца аб гэтым.

Трэба прыняць належныя меры, каб пабудаваць мясцовую прамысловасьць ва умовах таго ці іншага райёну.

Далей, неабходна нам устанавіць цьвёрды тэрмін калектывізацыі нашай краіны. Мы зараз маем такія пляны, якія будаваліся без вывучэньня сапраўдных магчымасьцяй. Нашы спэцыялісты і навуковыя сілы мала вывучалі сапраўднае становішча для складаньня гэтых плянаў. Гэта мы бачым па тым прыкладзе, што калі даюцца тыя або іншыя заданьні, то проста яны не грунтуюцца абсалютна ні на чым. Асабліва трэба гэта сказаць адносна нашых статыстычных органаў. Праца статыстыкі на сёньняшні дзень па вывучэньню нашай краіны, па вывучэньню магчымасьцяй, трэба сказаць, нікуды ня варта.

На гэта трэба будзе зьвярнуць увагу, бо у далейшым немагчыма так працаваць у сьляпую. Пры такіх умовах праца будзе вельмі дрэнная.

ПАВЯЛІЧЫЦЬ ТЭМП КАЛЕКТЫВІЗАЦЫІ.

Прамова т. Вараўка.

Я хачу адзначыць, што ў нас на мясцох, а іншы раз і акруговых і цэнтральных працаўнікоў ёсьць думка аб тым, што калектыў можна арганізаваць толькі тады, калі мы будзем забясьпечаны машынамі і кадрамі. Я лічу, што такая думка ня зусім правільная. На-першае калектыў хаця і без трактара, але ўсё-ж лепш, як індывідуальная гаспадарка.

У нас у Барысаўшчыне ёсьць таксама вялікія пэрспэктывы калектывізацыі. Зараз сярод рабочых і сялян ужо сабрана 20 тысяч рублёў грошай на трактары.

Калі толькі мяркуецца для ўсёй Менскай акругі адпусьціць 20 трактароў, то зразумела што Барысаўскі раён ніколі іх у патрэбнай колькасьці не атрымае. Адсюль нам прыдзецца нашы пляны будаваць па нашых магчымасьцях г. зн. атрымаць столькі трактароў, сколькі будзе і не спыняць тэмпу калектывізацыі, а яго працягваць.

Аб земляўпарадкаваньні я лічу, што з тымі кадрамі, якія мы маем зараз, нам цяжка будзе справіцца. Мы павінны правесьці большае земляўпарадкаваньне, чым да гэтага часу.

Ёсьць старыя калгасы, якія арганізаваны на былых абшарніцкіх землях. Гэтыя калгасы замкнуліся і нікога туды ня пушчаюць.

Прыдзецца гэтыя калектывы павялічыць каб ня было па 10 сямей, так як у Барысаўскім раёне.

Трэба адзначыць, што з калектывізацыяй адстала Менская акр., тут мы мала зьвярнулі ўвагі на калектывізацыю.

АБ УТВАРЭНЬНІ НАР. КАМ. ЗЕМЛЯРОБСТВА СССР.

Даклад тав. Рачыцкага.

Той адбудоўчы пэрыял, які мы мелі на працягу ўсіх мінулых гадоў, у асноўным скончаны. Першую задачу—адбудовы бядняцкіх і серадняцкіх гаспадарак мы вырашылі сіламі нашых нацыянальных рэспублік, у галіне рэканструкцыі сельскай гаспадаркі дапамога органаў Саюзу абмяжоўвалася толькі ўстанаўленьнем агульных падстаў землякарыстаньня, а ўсе агульныя плянавыя і фінансавыя мерапрыемствы праводзіліся выключна нацыянальнымі рэспублікамі.

Зараз, калі мы пераходзім у вышэйшую стадыю нашага будаўніцтва, у нас вырастаюць новыя задачы, зьвязаныя з разьвіцьцём больш высокіх форм сельскай гаспадаркі. Пытаньне адзінага рашучага наступленьня на капіталістычныя элемэнты, падрыхтоўка кадраў, увязка буйнай індустрыі з сельскай гаспадаркай—ня могуць быць вырашаны тымі мэтадамі, якія існавалі да гэтага часу. Мы ўжо ня можам абмяжавацца тымі сіламі і сродкамі, якія маюцца ў паасобных нацыянальных рэспубліках.

Калгасны рух выліўся ў шырачэзны рух бядняцка-серадняцкіх мас па шляху шпаркага разьвіцьця буйных калгасаў і суцэльнае калектывізацыі раёнаў і акруг, што з выключнай сілай выкрывае закладзеныя ў савецкім ладзе магчымасьці сацыялістычнага будаўніцтва.

Шырока разгарнулася таксама будаўніцтва буйных савгасаў. Усё гэта будаўніцтва і рэканструкцыя сельскай гаспадаркі на новай базе павінны быць цесна ўвязаны з будаўніцтвам буйнай індустрыяй Савецкага Саюзу, з праблемаю стварэньня сыравінай базы, з пытаньнем падрыхтоўкі кадраў.

З гэтымі задачамі нельга справіцца адзнымі сіламі пры наліччы абвостранай клясавай барацьбы ў нашай краіна.

Усе гэтыя абставіны сьведчаць аб тым, што пытаньні рэканструкцыі сельскай гаспадаркі ўжо перарастаюць рамкі паасобных нацыянальных рэспублік—і тут выклікаецца патрэба стварэньня адзінага кіруючага цэнтру. Мы маем ужо шэраг кіруючых цэнтраў па паасобных галінах сельскай гаспадаркі напрыклад: «Саюз Саюзаў", «Калгасцэнтр» «Сельгаснаб» „Трактарацэнтр", «Зернатрэст», „Скатавод" і шэраг іншых, якія ўжо зьяўляюцца не рэспубліканскімі, а агульна саюзнымі цэнтрамі.

І, урэшце, разгортваньне навуковаасьледчай справы ў галіне сельскай гаспадаркі зможа атрымаць найбольшы размах пры наяўнасьці агульна-саюзнага кіраўніцтва.

Для ажыцьцяўленьня гэтага адзінага кіраўніцтва ў галіне сельскай гаспаркі, для лепшай сувязі прамысловасьці з сельскай гаспадаркаю, для падрыхтоўкі разьмяркаваньня тых кадраў, якія нам патрэбны ў сельскай гаспадарцы выклікае неабходнасьць стварэньня такога саюзнага цэнтру для вырашэньня ўсіх пытаньняў, якія ня могуць быць вырашаны ва ўмовах паасобных нацыянальных рэспубліках.

Пагэтаму мы ўносім сёньняшняму Земляробчаму Сэсіі пытаньне аб утварэньні Народнага Камісарыяту Земляробства СССР, каб сельская гаспадарка на прыкладу прамысловасьці, дзе маецца саюзны цэнтр у асобе ВСНГ Саюзу, таксама мела-б свой Саюзны цэнтр, які-б плянаваў сельскай гаспадаркай і дапамог-бы нацыянальным рэспублікам пра весьці рэканструкцыю сельскай гаспадаркі на сацыялістычных падставах.

Спрэчкі па дакладу.

САЮЗНЫ НАРКАМЗЕМ УЗМАЦНІЦЬ ДЫКТАТУРУ ПРАЛЕТАРЫЯТУ.

Прамова т. Ігнатоўскага.

Калі мы зараз узьнялі такую вялікую сацыялістычную працу, ворагі ідуць супроць нас аб'яднанымі сіламі. Нашыя ворагі могуць гаварыць у сувязі з арганізацыяй Саюзнага Наркамзему аб парушэньні суверэнітэту беларускага народу.

Вось чаму я хацеў-бы некалькі слоў сказаць аб гэтым суверэнітэце. Ёсьць два суверэнітэты. Адзін суверэнітэт—гэта буржуазны, які лічыць, што ў нацыі павінна панаваць буржуазія, прыкрыўшыся адзіным нацыянальным фронтам—гэта ня наш суверэнітэт. Наш суверэнітэт, суверэнітэт пралетарскай дзяржавы. Мы стаім на грунце таго, што ўсё працаўоўае ў дзяржаве пралетарыят, які недзяслім. Пралетары ўсіх краёў, злучайцеся, да якой-бы нацыі не належылі, на якой мове-бы не гаварылі. І вось ясна, пры якім суверэнітэце магчыма будаваць сацыялістычную пабудову.

Ясна, пры суверэнітэцы пралетарыяту, мы стаім за суверэнасьць пралетарскую, мы стаім за суверэнасьць сацыяльную. Мы добра ведаем, што калі мы разаб'ём сілы пралетарыяту, сілы яго дыктатуры, яшчэ больш кулак адзіным фронтам пойдзе супроць нас, і мы зробім валікую памылку.

Праўда, і да гэтай пары Саюз ССР заўжды нам дапамагаў, заўжды дыктатура пралетарыяту ня толькі на Беларусі, але і ва ўсім Саюзе была нашай апорай. Тое, што мы зрабілі да гэтага часу, мы зрабілі ня толькі сваімі сіламі, нам дапамагалі. Але каб гэтую дапамогу яшчэ узмацніць, каб сканцэнтраваць гэтыя сілы, каб гэтую суверэнасьць пралетарскай дзяржавы ўзмацніць яшчэ, я лічу, што па практычных тэарэтычных матывах,—нам трэба бязумоўна так, як мы і раней гэта рабілі на нашых папярэдніх нарадах прасіць, каб існаваў Наркамзем СССР.

Няхай жыве СССР.

БУДЗЕ ПЛЯНАВА РЭГУЛЯВАЦЬ НАВУКОВУЮ ПРАЦУ.

Прамова тав. Гарэцкага.

Ужо папярэднія прамоўцы адзначылі ўсе тыя мерапрыемствы, якія маюць у БССР усесаюзнае значэньне, як мэліярацыя, культура балот, электрафікацыя, жывёлагадоўля, сельска-гаспадарчая індустрыя і г. д. Я спынюся толькі на адным кавалку работы, чыста практычным,—гэта на рабоце навукова-дасьледчай.

Вам, таварышы, вядома, што будаваць сацыялізм без навуковых падстаў немагчыма. Па гэтаму мы бачым такі дзіўны росквіт навуковых досьледаў у Саюзе, які выпярэджае ў дзесяткі разоў усе тэмпы навуковай працы ў дарэвалюцыйнай Расеі. Больш таго—мы маем у нашым Саюзе такія тэмпы навуковай працы, якія выпераджаюць тэмпы самых перадавых буржуазных краін, як Злучаныя Штаты, Нямеччына і г. д. і, ня гледзячы на такі бурны рост навуковай працы ў Саюзе, гэтая навукова-дасьледчая праца праходзіла ў розных формах, у паасобных Саюзных рэспубліках: Украіна мае сваю сыстэму, РСФСР сваю, БССР сваю, няма адзінства сыстэм навук.-дасьледчай працы, а ў зьвязку з гэтым няма адзінства тэмпу, адзінства зьместу ў навуковай працы, і часам мы робім тое, што ня трэба было-б рабіць.

З гэтага боку стварэньне Саюзнага Наркамзему адразу дасьць адзінства плянаваньня навукова-дасьледчай працы і значыць, больш пасьпяховае яе разьвіцьцё. Гэта-ж зьвязана з такім важным элемэнтам у навуковай працы, як навуковыя працаўнікі. Зараз мы маем няправільнае разьмеркаваньне навуковых кадраў у Саюзных рэспубліках.

Нарэшце, чыста агранамічныя кадры няправільна разьмеркаваны, больш таго, назіраецца вельмі вялікая цякучасьць іх. У чым прычына таго, што ў БССР, напрыклад, да паловы работнікі ідзе ў РСФСР, адтуль пераяжджае ў УССР і г. д.? Прычына ў тым, што стаўкі гэтых працаўнікоў не плянуюцца з аднаго цэнтру, што яны вельмі розныя нават у суседніх мясцовасьцях, напрыклад, у Віцебшчыне і Пскоўшчыне, або Смаленшчыне і Калініншчыне; стаўкі розьняцца на 30-40, нават на 50 проц., прычым часам у БССР большыя стаўкі, тады ідуць да нас, і наадварот. Гэта стварае неўстойлівасьць у разьмяшчэньні кадраў і, бязумоўна, Сюзны Наркамзем выправіць гэты недахоп.

ХУТЧЭЙ ВЫКАНАЕМ ЗАДАЧЫ.

Прамова т. Малашонка.

Рэканструкцыя сельскай гаспадаркі, калектывізацыя яе асабліва ва ўмовах нашай Беларускай Рэспублікі, дзе надзвычайна многа балот, якія патрабуюць ад нас надзвычайна вялікіх сродкаў,—з усімі гэтымі задачамі Беларускай Рэспублікі цяжка будзе справіцца толькі сваімі сіламі.

Ставячы задачу рэканструкцыі сельскай гаспадаркі ў саюзным маштабе, мы павінны сканцэнтраваць усе нашы магчымасьці дзеля таго, каб больш правільна іх разьмеркаваць паміж паасобных частак нашага Савецкага Саюзу.

Таму мне думаецца, што ад стварэньня Саюзнага НКЗему БССР павінна будзе ў значнай меры выйграць.

Кляса супроць клясы.

Здраднікі дамагліся „перамогі".

ВЕНА, 23-11. Агульны сход бастуючых рабочых фабрыкі Хэйда ў Штокераў (галоўным патрабаваньнем рабочых было—звольніць прынятых на фабрыку фашыстаў замест зволеных рабочых) зацьвердзіў згоду, утвораную рэфармісцкімі кіраўнікамі прафсаюзу з прадпрыемцамі аб аднаўленьні працы і дапушчэньні да яе зволеных фашыстаў.

Буржуазны друк адзначае поўную капітуляцыю і паражэньне прафсаюзу.

Дэманстрацыі камсамолу ў 10-я угодкі КІМ'у.

ВЕНА, 23-11. Назначаная на сёньня ў адзнаку 10-х угодак КІМ'у вулічная дэманстрацыя аўстрыйскага камсамолу забаронена паліцыяй.

* * *

ВЕНА, 23-11. У Стакгольме адбыўся вялікі мітынг рабочай моладзі, прысьвечаны 10-м угодкам КІМ'у. Мітынг скончыўся дэманстрацыяй.

Па ўсёй Фінляндыі адбываюцца сходы пратэсту.

ГЕЛЬСІНГФОРС, 20-11. Водлуг паведамленьня друку, па ўсёй краіне адбываюцца, у сувязі з галадоўкай палітычных зьняволеных, сходы пратэсту, якія разганяюцца паліцыяй. Сацыял-дэмакраты праводзяць шалёную кампанію супроць назначанай на сёньня забастоўкі пратэсту.

Арышт рэдактара „Ротэ Фанэ".

ВЕНА, 23-11. Арыштован галоўны рэдактар аўстрыйскай камуністычнай газэты „Ротэ Фанэ" Шулер. Ён абвінавачан у дзяржаўнай здрадзе.

Бойка беспрацоўных з паліцыяй.

ВЕНА, 23-XI. У Бухарэсьце адбылася 20-га лістапада масавая дэманстрацыя беспрацоўных. Здарыліся сутычкі з паліцыяй, якая арыштавала шмат удзельнікаў дэманстрацыі.

Пасьля перамогі кампартыі.

БЭРЛІН, 23-11. Пасьля таго, як выявілася значная перамога камуністаў па камунальных выбарах у Рурскай вобласьці, рабочыя ў Глядбэку і Шультэнбэрзе ўзьнялі чырвоныя сьцягі над мясцовымі муніцыпалітэтамі.

Рэвалюцыйныя рабочыя выкідаюць фашыстаў з фабрык.

ВЕНА, 23-XI. На вялікай фабрыцы запалак у Тэмэшвары рэвалюцыйныя рабочыя зьбілі сацыял-фашысцкіх прафпрацаўнікоў і выгналі іх з фабрыкі. Рэфармісты выклікалі паліцыю, якая пачала біць рэвалюцыйных рабочых і разагнала іх. Арыштавана 15 чалавек, у тым ліку ўнітарныя прафпрацаўнікі Шэн і Кельен. Абодвы былі моцна скатаваны.

У Саюзных Рэспубліках.

Вон здраднікаў з навуковых шэрагаў.

МАСКВА, 24-XI. Цэнтральнае бюро сэкцыі навуковых працаўнікоў у сувязі з выяўленьнем контр-рэвалюцыйнай арганізацыі па Украіне, ухваліла наступную рэзалюцыю:

«З пачуцьцем найвялікшага абурэньня Цэнтральнае бюро сэкцыі навуковых працаўнікоў даведалася аб тым, што сярод кучкі агідных здраднікаў ёсьць імёны выдатных навуковых дзеячоў Украіны. Цэнтральнае бюро сэкцыі навуковых працаўнікоў заклікае ўсіх савецкіх вучоных у адказ на наглую дзейнасьць контр-рэвалюцыянэраў узмацніць барацьбу з рэакцыйнымі элемэнтамі ў сваіх уласных шэрагах і ўдзесяцярыць энэргію ў рабоце па сацыялістычнаму будаўніцтву".

Працоўныя вітаюць ДПУ—вернага вартаўніка пралетарскай дыктатуры.

ХАРКАЎ, 22-XI. Агалошанае ў газэтах паведамленьне аб ганебнай працы выкрытай ДПУ контр-рэвалюцыйнай арганізацыі пад назваю „саюз вызваленьня Украіны" выклікаў глыбокае абурэньне ўсіх працоўных Украіны. Канфэрэнцыя ўдарнікаў у Краменчугу паслала шчырае прывітаньне ДПУ—вернаму вартаўніку пралетарскай дыктатуры.

Паведамленьне выклікала таксама вялікае абурэньне сярод рабочых, якія патрабуюць самага суровага пакараньня контр-рэвалюцыянэраў.

Зарубежны пралетарыят забясьпечыць сацыялістычнае будаўніцтва.

МАСКВА, 24-XI. Учора ангельскія і нямецкія гарнякі паведалі ЦК саюзу гарнякоў, дзе яны заявілі: «Галоўная праца пралетарыяту за рубяжом павінна заключацца ў тым, каб забясьпечыць Савецкаму Саюзу магчымасьць прадаўжаць сваё будаўніцтва. Рабочая кляса ўсяго сьвету павінна стаць на абарону СССР, які зьяўляецца крэпасьцю сусьветнай рэвалюцыі».

ВТУЗ'ы пераходзяць на непрарыўны вучэбны год.

МАСКВА, 25-XI. Пры галоўным кіраўніцтве ВТУЗ'аў адбылася нарада рэктароў сумесна з прадстаўнікамі Галоўпрафабра, ЦБ Пралетстуда. Нарада заслухала даклад аб практычным ажыцьцяўленьні рашэньняў лістападаўскага пленуму ЦК УсеКП(б). Даручана кіраўніцтву ВТУЗ'амі прыступіць да перагляду сеткі існуючых ВТУЗ'аў з пункту погляду іх мэтавай устаноўкі і пераводу работы на бесперарыўны вучэбны год.

Пратэстуем супроць нападу на савецкае консульства ў Львове

ХАРКАЎ, 25-XI. У адказ на напад польскіх студэнтаў-фашыстаў на савецкае консульства ў Львове, адбыўся масавы мітынг пратэсту і бурная дэманстрацыя пралетарскага студэнцтва. У мітынгу і дэманстрацыі прынялі шчыры ўдзел прафэсура і выкладчыкі.

Пуцілаўцы перадалі сьцяг Чырвоным франтавікам.

МАСКВА, 25-XI. Член ЦК саюзу мэталістых тав. Ягорава ад імя рабочых «Чырвонага Пуцілаўца», уручыла нямецкай дэлегацыі чырвоны сьцяг, для перадачы яго Чырвоным франтавікам Ганнвера.

Шосты выпуск інжынэраў-мэханікаў.

МАСКВА. У вайскова-паветранай Акадэміі імя Жукоўскага адбыўся шосты выпуск інжынэраў і мэханікаў паветранага флёту. Выпушчана 39 інжынэраў, 82 процанты з іх—камуністы, па сацыяльным складзе—50 проц. рабочых.

Пяцігодку выканаем у 4 гады.

ЛЕНІНГРАД, 22-11. Заводы «Гигант», «Красный Путиловец», Балтыцкі мэталюргічны «Электросила» і Ижарскі ў адказ на выклік „Красного Треугольника" распачынаюць перапрацоўку пяцігадовага пляну ў чатырохгадовы.

З пастановы бюро Аршанскага АК КП(б)Б у сувязі з артыкулам „Аршанскія прарывы".

1. Прыняць да ведама заяву т. т. Сьвірыдава і Грабенчыка аб тым, што справа аб паломцы аўтамабілю акрвыканкому расьсьледвалася сьледчымі органамі і разглядалася АКК і ўстаноўлена, што тав. Грабенчык зусім ніякага дачыненьня да гэтай справы ня меў.

2. Прызнаць беспадстаўным і няправільным абвінавачаньне тав. Грабенчыка.

3. Прасіць КК паскорыць высьвятленьне фактаў, паказаных у заметцы газэты «Зьвязда» „Аршанскія прарывы", і аб выніках паведаміць бюро АК.

ЧЫРВОНАЯ БЕЛАРУСЬ

ШТУРМУЕМ СТАРЫЯ УСТОІ*).

(Мова фактаў).

НОВЫ ЧАЛАВЕК ІДЗЕ.

Тая бяднячка, якая так рашуча абараняла ўласнасьць, якая праз засеянае калгаснае поле гатова была на кані ехаць, сёньня ў калгасе.

Пабачым, як яна адносіцца да калектыўнай «уласнасьці».

Вось яна корміць калгасных параслят. Чысьценькія, беларуковыя. курносыя «панічы» б'юцца адзін з другім над карытам... Баба разводзіць рукамі.

— Ды ты-б іх пугай разьняла,—дапамагае калгасьніцы тав. С.

— Ой, што вы? Як-жа можна пугай, калі ён як панічок беленькі ды чысьценькі. Гэта ня нашы ранейшыя, што з доўгімі лычамі...

— А яны-ж калгасныя?»

— Дык ці я ведала, што будзе так? Я ня думала...

А вось беднячок-калгасьнік расказвае пра свае сучасныя настроі:

— Раней выедзеш ты на сваю палоску, а яна нібы галодная кішка цягнецца; ня толькі сабака, кошка ўпепярак ляжа, дык хвост праз межу на чужую паласу пераваліцца.

— Запяе жаўранак, дык нібы цьвіком па душы шкрабе. Пугаю, здаецца, прагнаў бы сьпевака.

І конь ісьці ня хоча, а калі-б і хадзіў, дык што ён выхадзіць: усё роўна жраць няма чаго.

А цяпер нават варона, нашто паганая птушка і тая неяк прыемна крычыць. Ляціць над вёскай, якая ня вышла ў калгас, і пасьмішліва крычыць—

— Халмы, халмы...

А над намі выразна і сур'ёзна вымаўляе—

— Калгас, калгас...

— Ды што вы кажаце, зусім новае жыцьцё найшло... Вы-ж чуеце, як весела гурчыць трактар, нібы з кулямёту па старому жыцьцю...»

— Так, ідзе новы чалавек.

Але-ж гэта робіцца зусім ня так, як некаторыя мастакі малююць на палатне: шырокі шлях, а ўперадзі як вялікі таз сонца, а вакол праменьні новага жыцьця... І ідзе чалавек вясёлы, з песьняй, з урачыстым тварам, нібы на сьвята.

Ня так гэта ў жыцьці, хоць бы і ў той самай Клімаўшчыне, дзе энтузіязм калгаснага руху робіць калгасы «скрозь».

У муках родаў нараджаецца новы чалавек.

А таму вялікаму руху, той працы, якая праводзіцца ў Клімаўшчыне, патрэбна ўсямерная дапамога...

ПРЫНЦЫПОВЫЯ „ДРОБЯЗІ".

Клясавая сьвядомасьць беднякка-серадняцкіх мас расьце шпаркім тэмпам. Аб гэтым сьведчаць вышэйпададзеныя факты.

Вораг выкрываецца і пад маскай. Беднята дае суровы адпор кулаку і яго хаўрусьнікам. Серадняк ідзе ў калгасы. Беднякка-серадняцкі блёк мацнее.

А кулак? Прынцыпова пытаньне аб ім вырашана. Кулак павінен быць ізаляваны. Яму ня месца ў калгасе. У цэлым шэрагу фактаў, перададзеных мне Клімавіцкімі раённымі работнікамі, не адчуваецца гэтай вострай устаноўкі на ізаляцыю кулака.

Ёсьць выпадкі, калі кулак як шкоднік калгаснага руху „пакрываецца з палічнымі", „выстаўляецца" з калгасу і ўсё-ж нарэшце ён ізноў пралазае ў калгас, каб больш тонка, мэтадамі глыбокага падчольля весьці сваю разбуральную работу.

Нейкай няшчырасьцю нясе ад тых кулакоў, якія трапілі ў калгас, расказвае тав. Тарасенка. Ім не падабаецца шмат што ў нашым калгасе... Яны ўздыхаюць, крывяцца, стогнуць, скуляць...

Мне думаецца, што да той агульнай устаноўкі, якая дадзена партыяй у дачыненьні да клясавай барацьбы на вёсцы, трэба дадаць цэлы шэраг канкрэтызуючых паказаньняў месцам.

У гэтых паказаньнях неабходна па магчымасьці даць адказ на ўсе канкрэтныя запытаньні, якія паўстуюць у працэсе сацыялістычнай перабудовы вёскі.

Скажам прыклад. Вёска пайшла ў калгас. Кулацкая частка належным чынам ізалявана і атрымала вучастак побач з другой вёскай, якая яшчэ не калектывізавана. Прышла чарга і да другой вёскі. У парадку земляўпарадкаваньня яна прэтэндуе на вучастак заняты выселенымі кулакамі і г. д. Там, дзе праводзіцца шпаркім тэмпам калектывізацыя, асабліва пры суцэльнай калектывізацыі, такія канкрэтныя пытаньні набываюць вастрату прынцыповых пытаньняў.

Гутарка з раённымі работнікамі пераканала мяне ў тым, што і ў пытаньні з папаві на мясцох няма належнай чоткасьці і выразнасьці на практыцы работы.

І тут патрэбны тлумачэньні і канкр

Савецкае будаўніцтва.

РАБОТУ СЕЛЬСАВЕТАЎ—ПАД КАНТРОЛЬ МАС.

Надыходзячыя перавыбары саветаў трэба скарыстаць для ўзмацненьня сельскіх саветаў.

Сельскія саветы трэба ачысьціць ад падкулачнікаў, п'яніц і валакітчыкаў.

РАБОТУ СЕЛЬСАВЕТАЎ—НА ВЫШЭЙШУЮ СТУПЕНЬ.

Больш самастойнасьці сельсаветам.

У парадку абгаварэньня.

У праэкце асноўных палажэньняў пра арганізацыю сельскіх саветаў—ёсьць каштоўны матар'ял аб перабудове сельсаветаў і набліжэньні іх да мас у сувязі з перабудовай нашай вёскі на сацыялістычны лад. Але ў гэтым праэкце ёсьць шмат адмоўных бакоў.

Паперша: утрыманьне такіх саветаў патрабуе значных выдаткаў. Калі налічыць канцэлярскія выдаткі, наём памяшканьняў пад канцэлярыю, апал, асьвятленьне і інш., дык гэта выйдзе, што мы дарэмна будзем выкідаць значныя сумы, за якія можна будзе ў адзін год пабудаваць вялізарны завод, які дасьць больш карысьці дзяржаве, чым гэтыя маленькія сельсаветы.

Падругое: у той час, калі мы ставім пытаньне аб пашырэньні праў сельсаветаў, дык у новым праэкце, нават, прэзыдыум утвараецца ў некаторых толькі сельсаветах і то згодна пастановы ўраду Саюзных Рэспублік. Гэта значыць, што правы сельсаветаў звужаны.

Пра сельскія суды, якія хаця існуюць першы год, але сябе цалкам апраўдалі,—нічога зусім ня сказана, а сялянне арганізацыяй судоў надта задаволены.

Патрэцяе. У праэкце сказана, што некаторыя такія маленькія саветы будуць мець самыя поўныя бюджэты. Цікава было-б запытаць, ці змогуць гэтыя саветы з паступленьняў сельскагаспадарчага падатку аплаціць толь кі сябе ў працягу году, бо прамысловасьці ў нас на вёсцы яшчэ няма.

Але ня гледзячы на гэта, перабудову нашых сельсаветаў трэба зрабіць не адкладаючы.

Трэба, каб старшыня і сакратар ня былі адначасова адміністратарамі і выканаўцамі, бо ад гэтага губляецца аўтарытэт працаўнікоў сельсавету. Калі сельсавет каго небудзь аштрафоўвае і яго работнікі ідуць спаганяць гэты штраф, дык ім кажуць, што ў сельсавеце ад гэтага кульгае праца. Там чакаюць сяляне, а сельсаветчыкі ходзяць ды спаганяюць штрафы, якія-ж самі і накладалі. Ад гэтага ёсьць шмат выпадкаў, калі ў сельсавет пачынаюць наведвацца ўначы, а калі скажаш, што заняткаў цяпер няма, дык селянін пачынае даказваць, што сельсавет днём быў зачынены.

Для ажыўленьня працы сельсаветаў трэба цалкам згадзіцца з артыкулам т. Савіцкага Я. М. (гл. „С. Б." № 246 ад 26-X б. г.), але толькі замест пасады дзелавода ўвесьці штатную адзінку нам. старшыні сельсавету, які выконваў-бы ўсю працу на раёне, а ў вольныя часы працаваў бы ў канцэлярыі як дзелавод, бо наёмных дзелаводаў за такую нізкую плату вельмі цяжка знайсьці.

А. Калтовіч.

АД РЭДАКЦЫІ: Рэдакцыя зьвяртаецца да ўсіх працаўнікоў саветаў адклікнуцца на гэты і папярэднія артыкулы аб пашырэньні правоў сельсаветаў.

Падрыхтоўка да перавыбараў саветаў на Аршаншчыне.

НЕ ДАПУСЬЦІМ ПАМЫЛАК МІНУЛАГА ГОДУ.—РАБОЧЫЯ БРЫГАДЫ ДАПАМОГУЦЬ ВЯСКОВАЙ БЕДНАЦЕ.

Прэзыдыум акрвыканкому вызначыў шэраг практычных мерапрыёмстваў па пытаньню падрыхтоўкі да справаздачы і перавыбараў саветаў.

У пастанове прэзыдыуму рашуча ставіцца пытаньне аб тым, каб падрыхтоўчыя мерапрыемствы райвыканкомаў і саветаў праводзіліся пад лёзунгам — 100 проц. забесьпячэньня ўдзелу рабочых і сялян на справаздачных і перавыбарчых сходах.

Адначасова завастраецца ўвага на зьнішчэньне недахопаў, якія мелі месца ў час падрыхтоўкі да перавыбарчай кампаніі саветаў і ў самой кампаніі ў мінулым годзе.

Гэтыя недахопы былі наступныя: маруднасьць у правядзеньні падрыхтоўчай работы да кампаніі перавыбараў саветаў; недастатковая праца сярод батрацтва, беднаты, жанчын і нацменшасьцяў; наліччa параўнаўча буйных вучасткаў; недастатковая работа па падбору кандыдатур у новы склад саветаў; слабы, а часам і нездавальняючы ўдзел савецкіх установаў, прафсаюзных і грамадзкіх арганізацый у падрыхтоўчай рабоце і самой справаздачна-перавыбарчай кампаніі саветаў.

Райвыканкомам і саветам даручана арганізаваць выбарчыя камісіі да 5 сьнежня. Пасьля чаго да 10 лістапада райвыканкомы павінны склікаць райённыя двухдзённыя курсы-нарады старшынь нізавых выбарчых камісій, з якімі будуць прапрацаваны інструкцыя аб перавыбарах саветаў, арганізацыйны плян справаздачна-перавыбарчай кампаніі кожнага савету паасобку і райёну наогул.

Райвыканкомы і акрвыканкомы будуць рабіць справаздачу аб сваёй дзейнасьці на прадпрыемствах, пленумах калгасаў, савгасаў і больш буйных вёсках на працягу сьнежня і студзеня.

25-га лістапада склікаецца нарада работнікаў акруговых установаў па пытаньню правядзеньня падрыхтоўча-арганізацыйных мерапрыемстваў да перавыбараў саветаў.

З 20-га сьнежня на вёску, у райёны, саветы паедуць рабочыя брыгады і шэраг алкавых работнікаў для дапамогі ў правядзеньні справаздачнай і перавыбарчай кампаніі саветаў.

А—ч.

Правы ўхіл у практыцы В.-Крушынаўскага с.-с.

Хістаньні ў правядзеньні генэральнай лініі партыі захапляюць і працаўнікоў сельсаветаў. Узяць, к прыкладу, пытаньне аб выдачы пасьведчаньняў сялянам аб патрэбе ў зямлі па нашаму сельсавету. Большасьць пасьведчаньняў напала заможнікам: Кушняру Яўхіму, Баранаву Сьцяпану, і яны ў лясьніцтве атрымалі ў арэнду па некалькі гэктараў вельмі ўдобных зямель—ляды, па 8 р. за гэктар. А беднякі Раманькоў Церах, Васькаў Архіп і інш. не атрымалі і кавалку лядаў.

Другі прыклад правага ўхілу, гэта няпоўнае выяўленьне кулацкіх гаспадарак па В.-Крушынскаму сельсавету. Калі ўзяць усіх кулакоў і заможнікаў, дык іх налічыш да 2-х дзесяткаў, а абклалі толькі 3 гаспадары, ды і то не кулацкія, а моцных сераднякоў, як напрыклад Дойлідава Якуба. Сваяка старшыні сельсавету Сушчэўскага Малаха не абклалі, Васільлева Ігната, Бондарава Лукаша, Ісакава Пятра, Кушнерава Яўхіма—гэтых сельсавет чамусьці не нашоў магчымым абкласьці ў індывідуальным парадку. А прычына тут тая, што прадстаўнікі сельсавету ня хочуць наступаць на кулака, не жадаюць вырываць з карэньнем капіталізм, які моцна засеў і перашкаджае ўсяму нашаму будаўніцтву.

Я. Кр.

Рагачэўскі раён.

Кулак за сьпіной некаторых сельсаветаў.

(Ад нашага карэспандэнта).

Кры правядзеньні працы на сельска-гаспадарчаму падатку выяўлен на Бабруйшчыне цэлы шэраг фактаў, калі сельскія саветы, батрачкомы і нават прадстаўнікі райвыканкомаў абараняюць у сваёй працы кулакоў індывідуальнікаў, дапамагаюць ім аслабаніцца ад індывідуальнага абкладаньня па сельска-гаспадарчаму падатку.

Вось возьмем хоць бы Слуцкі раён. У вёсцы Машчыцы ўсе гаспадаркі, якія цяпер абкладзены падаткам у індывідуальным парадку, маюць на руках сельсавецкія пасьведчаньні аб тым, што іх ні ў якім разе нельга абкладваць індывідуальна, што яны зьяўляюцца не заможнымі, а серадняцкімі гаспадаркамі.

Возьмем вёску Кулічы. Тут старшыня савету сам выступае супроць усяе беднаты вёскі. Беднота залуляе, што гр. Ляшкоўскі зьяўляецца кулаком, што яго трэба абкласьці ў індывідуальным парадку, а старшыня савету творыць сваё. Ён выдае Ляшкоўскаму спраўку аб тым, што Ляшкоўскі не зьяўляецца заможнікам.

Асабліва багата такіх прыкладаў ёсьць па Бабруйскаму раёну. Такія выпадкі тут падчас даходзяць да самай дзікай формы. Напрыклад, па Рымавецкаму сельсавету мясцовая падатковая камісія парашыла абкласьці ў інцывідуальным парадку гр. Гардзевіча Адама.

У працы камісіі прымаў удзел сельсавет, але апошні праз некаторы час выдае гэтаму індывідуальніку даведку аб тым, што ён не падлягае індывідуальнаму абкладаньню.

Асабліва ў гэтай справе граюць на дудку кулака сябры сельсаветаў. Пры правядзеньні падатковай працы прыходзілася сустракацца з сотнямі фактаў, калі сябры сельскіх саветаў сваімі даведкамі абаранялі кулака ад індывідуальнага абкладаньня.

У тым жа Бабруйскім раёне такі-ж самы „фокус" выкінуў і Боркаўскі батрачком, які выдаў на рукі кулаку Малішэўскаму спраўку, што наймовае сілы ў яго ня было, у той час, як на самой справе ў Малішэўскага мелася наймовая рабочая сіла.

На чарзе прадстаўнікі райвыканкомаў.

Упаўнаважаны Слуцкага райвыканкому Аскерка, якому было даручана абсьледваць гаспадарку кулака Ражанца, у сваіх вывадах кажа, што гэтая гаспадарка серадняцкая, што яна ня мае наймовае рабочае сілы, у той час, як апошняя ў гэтай гаспадарцы маецца. Такія факты ёсьць і па Парыцкаму раёну.

Такія факты ёсьць і ня толькі ў Бабруйшчыне, яны ёсьць і ў іншых акругах. На працу сельсаветаў нам трэба зьвярнуць асаблівую ўвагу, выкрываючы і вырываючы з карэньнем усякае патаканьне кулаку.

А. Дамброўскі.

Злачынцы з сельсавету будуць пакараны.

Магілеў, 21-XI. Гэтымі днямі станоўць перад пралетарскім судом „працаўнікі" Гарадзішчанскага сельсавету, Клімавіцкага раёну—Шчуракоў, Аўхіменка і Асіпенка, дзейнасьць якіх на Клімаўшчыне адзначылася нябачанымі яшчэ злачынствамі.

Працуючы толькі для сваіх інтарэсаў, гэтыя сельсаветчыкі даводзілі да поўнага зрыву ўсе гаспадарча-палітычныя кампаніі на вёсцы.

Старшыня КСУ Асіпенка растраціў 200 р. скарбовых грошы, невядома каму выдаў 300 пудоў насеньня і рабіў цеганіну са справаздачнасьцю.

Уся гэта кампанія шчыра абаранялі кулакоў і ўсялякіх назбаўленцаў, на чале з былым абшарнікам-контррэвалюцыянэрам Глазоўскім. П'янкам і гультайству ня было межаў.

Зараз сьледчыя органы выявілі ўсю брыдоту. Бядняцка-серадняцкія колы Клімаўшчыны патрабуюць паказальнага працэсу над злачынцамі.

Л-ны.

Узмацнім рэдакцыю „Рабочий" новымі кадрамі.

У лютым г.г. супрацоўнік рэдакцыі газэты „Рабочий", загадчык аддзелу „Рабочае жыцьцё"—Мануйлаў зьвярнуўся да другога супрацоўніка газэты —Лінскага з просьбай затрымаць друкаваньне фэльетону па справе аб злоўжываньнях у Белпасрэдніку.

Палітычнае значэньне гэтай просьбы „савецкага" журналіста характарызуе той факт, што ў ліку асоб, якія выкрываліся рабкораўскімі лістамі аб злоўжываньнях у Белпасрэдніку—фігуравалі дзядзька Мануйлава—Файнштэйн.

Фэльетон аб Белпасрэдніку („Лакеи частного капитала") быў зьмешчаны ў газэце «Рабочий» 27 лютага г.г. Незадаволены гэтым Мануйлаў „успомніў" Лінскаму выпадак, калі Лінскі прасіў рабкора Левіна замяніць у артыкуле прозьвішча яго, Лінскага, шваграм—ініцыяламі.

Цэлы месяц Лінскі нікому не гаварыў аб просьбе Мануйлава. І толькі калі пасварыўся з Мануйлавым, Лінскі падаў аб гэтым заяву.

Дамагаючыся затушаваньня рабкораўскага артыкулу па справе свайго шваграм, пакрываючы на працягу месяцу праступак Мануйлава, Лінскі ў сваіх фэльетонах асабліва ў гэты час, каб адцягнуць увагу ад сваіх ганебных спраў, дапушчаў яўнае перахлёстваньне, імкнучыся да сэнсацыі (як гэта было з фэльетонам аб Канцлеру).

Мануйлаў быў зьняты з адказнай працы загадчыка аддзелу, але расьледваньне аб ім цягнулася. Мясцком газэты „Рабочий" недаацаніў важнасьці гэтай справы, не надаў яму адпаведнага палітычнага значэньня і не стварыў навакал яе пырокай грамадзкай пралетарскай думкі.

У асьвятленьні гэтых галоўных палітычных задач ганебныя спробы супрацоўнікаў газэты „Рабочий" Мануйлава і Лінскага зьяўляюцца ня толькі праступкамі, за якія можна ўскладаць тое ці іншае спагнаньне. Як правільна гаворыць у сваёй пастанове па гэтай справе ЦП саюзу друкароў: „зьяўляючыся па сутнасьці справы хадатаямі за клясавага ворага, пакрываючы злачынныя дамаганьні—супрацоўнікі „Рабочего" Мануйлаў і Лінскі зрабілі праступкі, ганебныя журналіста савецка-партыйнага друку і пераходзілі на рэйкі супрацоўніцтва з клясавым ворагам".

ЦП саюзу друкароў правільна прызнала немагчымым далейшую працу Мануйлава і Лінскага ў органах савецкага друку. ЦП лічыць, што за такі праступак павінна быць пастаўлена пытаньне аб знаходжаньні Мануйлава ў шэрагах саюзу, але улічваючы, што Мануйлаў асудзіў свой праступак, прызнаў сваю віну, ЦП лічыць магчымым пакінуць яго ў шэрагах саюзу.

Расьледваньне справы Мануйлава і Лінскага выявіла шэраг недахопаў у практычнай працы апарату рэдакцыі газэты „Рабочий".

Частка камуністаў—працаўнікоў рэдакцыі не справілася з палітычным кіраўніцтвам газэты. Асобныя камуністы аказаліся ў ідэйным палоне ў беспартыйных супрацоўнікаў, непасрэдна зьвязаных з клясавым ворагам (Мануйлава і Лінскага). У сувязі з гэтым былі выпадкі пераходу рамак пралетарскай самакрытыкі ў газэце, выпадкі таннай сэнсацыі, бессароннай „алилуйщины", распушчанага тону некаторых фэльетонаў (у першую чаргу фэльетон Езерскага аб Гомелі, справа Канцлера і інш.) Гэтыя сур'ёзныя недахопы аказаліся немагчымымі таму, што ўнутры рэдакцыі адсутнічала самакрытыка, сярод большай часткі працаўнікоў рэдакцыі стварылася сямейственнасьць, асобныя камуністыя зрошчваліся з чужым элемэнтам, ня было дапамогі рабочым-вылучэнцам, якія ігнараваліся і нават былі зьневажаючыя адносіны да іх Лінскім і Мануйлавым. Гэтыя хваравітыя зьявішчы ў значнай ступені тлумачацца тым, што адсутнічала сыстэматычнае кіраўніцтва з боку ячэйкі партгрупай газэты „Рабочий", што зазначэньні ячэйкі ігнараваліся партгрупай.

Для аздараўленьня абставін у апараце рэдакцыі газэты „Рабочий" з боку АПАД ЦК КП(б)Б, Фрунзаўскага райкому партыі, Акругкому, ЦП саюзу друкароў і адміністрацыі газэты ўжыта шэраг мерапрыемстваў.

Замест звольненых супрацоўнікаў Мануйлава і Лінскага для працы ў рэдакцыі вылучана два рабочых з вытворчасьці—рабкоры т. т. Цыпкін і Новікаў. Пастаўлена пытаньне аб далейшым узмацненьні рабочай праслойкі, паляпшэньні кіраўніцтва газэтай, аб хуткім вырашэньні пытаньня аб сталым рэдактары газэты „Рабочий", аб сыстэматычным кіраўніцтве з боку бюро ячэйкі партгрупай рэдакцыі і інш.

Гэтыя мерапрыемствы, частка якіх ужо ажыцьцёўлена, напоўне, аздаровяць абставіны ў рэдакцыі і зробяць магчымым значна лепшае выкананьне газэтай вялікіх задач, ускладаемых на друк партыяй, рабочай клясай і савецкай грамадзкасьцю.

Аб становішчы і працы газэты „Рабочий".

Рэзалюцыя Фрунзаўскага райённага камітэту КП(б)Б, зацьверджаная бюро АК КП(б)Б.

1. Абвастрэньне клясавай барацьбы ў горадзе і вёсцы, абумоўленае пераможным рухам наступу сацыялістычных элемэнтаў на капіталістычныя элемэнты краіны, ускладае на наш партыйна-савецкі друк выключную адказнасьць у правядзеньні выразнай клясавай лініі, на выкрыцьці ўсяго клясава-чужога, мабілізацыі сіл рабочае клясы супроць усялякіх вылазак клясавага ворага на ўсіх вучастках сацыялістычнага фронту, супроць усялякіх хістаньняў у асяродзьдзі рабочае клясы і ўхілаў унутры партыі, асабліва супроць правага ўхілу, як галоўнай на даным этапе небясьпекі ў партыі, таксама і «левых» трацкісцкіх загібаў.

Асабліва важную ролю наша прэса павінна адыграць у ажыцьцяўленьні дырэктыў партыі па разгортваньню сьмелай пралетарскай самакрытыкі,—як мэтад уцягненьня шырокіх мас працоўных ва ўсё сацыялістычнае будаўніцтва краіны.

У асьвятленьні паказаных задач роля камуністаў—работнікаў друку набывае асабліва важнае значэньне, як людзей, якія закліканы ажыцьцёвіць правільную партыйную лінію на асабліва адказным вучастку работы ў нашай прэсе.

2. Аб'яднанае паседжаньне бюро Фрунзаўскага РК КП(б)Б з фракцыяй ЦП саюзу друкароў, пры ўдзеле прадстаўнікаў АПАД ЦК КП(б)Б, азнаёміўшыся са становішчам работы ў рэдакцыі газэты „Рабочий",—**прызнаючы ў асноўным правільнай палітычную лінію газэты**, адзначае, што ў практычнай рабоце апарату рэдакцыі газэты «Рабочий» мелі месца перакрыжаваньні паасобна «левых» загібаў з праявамі права апартуністычнай практыкі.

Частка камуністаў—работнікаў рэдакцыі газэты „Рабочий" ня справілася з палітычным кіраўніцтвам газэты. Паасобныя камуністы апынуліся ў ідэйным палоне ў беспартыйных работнікаў, непасрэдна зьвязаных з клясавым ворагам. Мелі месца выпадкі перахлёстваньня і імкненьня за сэнсацыяй. Унутры самой рэдакцыі адсутнічала самакрыта. У большай частцы работнікаў рэдакцыі ўстанавілася сямейнасьць. Былі моманты зрастаньня паасобных камуністаў з чужымі элемэнтамі (супольная выпіўка, паведамленьне беспартыйным партыйных (пастаноў і дакумэнтаў), моманты нежаданьня дапамагчы вылучэнцам і зьнявагі да іх.

3. Бюро райкому асабліва падкрэсьлівае недапусьцімы адрыў часьці газэты «Рабочий» ад ячэйкі друкарні «Зьвязда», у сувязі з чым, апошняя ў цэлым шэрагу важнейшых пытаньняў была ігнаравана і не інфармівалася камуністамі, якія працуюць у газэце „Рабочий" з прычыны чаго ўсе хваравітыя зьявішчы ў рэдакцыі газэты „Рабочий", былі выкрыты ячэйкай з спазьненьнем. Адначасова бюро РК адзначае адсутнічаньне сыстэматычнага кіраўніцтва з боку ячэйкі партгрупай газэты «Рабочий».

Выходзячы з усяго гэтага бюро Фрунзаўскага РК пастанаўляе:

4. За замазваньне недахопаў і хваравітых зьявішч у рэдакцыі газэты „Рабочий", за нерэагаваньне на ўчынкі работніка газэты Мануйлава, зьвязанага непасрэдна з клясавым ворагам і які дамагаўся замазваньня справы Белпасрэдніка, —распусьціць мясцком газэты «Рабочий».

Лічыць неабходным ачысьціць рэдакцыю ад чужых элемэнтаў. У першую чаргу даручыць фракцыі ЦП і рэдакцыі „Рабочий" зьняць Мануйлава і Лінскага з работы, як людзей, якія дыскрэдытуюць сваімі паводзінамі пралетарскі друк.

5. Адзначыць марудпасьць у правядзеньні папярэдніх дырэктыў АК КП(б)Б і прэзыдыуму АКК аб зьняцьці Лінскага.

6. Паставіць пытаньне перад АПАД ЦК КП(б)Б аб хутчэйшым вырашэньні пытаньня аб адказным рэдактары газэты «Рабочий».

7. Зазначыць бюро ячэйкі «Зьвязда» на адсутнічаньне дастатковай увагі і сыстэматычнага кіраўніцтва з боку бюро ячэйкі партгрупай рэдакцыі газэты «Рабочий».

Лічыць немагчымым пакінуць на рабоце ў рэдакцыі газэты «Рабочий» т. т. Бумбэрг і Бароцкага, як членаў партыі, якія падпалі пад уплыў сацыяльна-чужых элемэнтаў.

8. Лічыць неабходным узмацніць вылучэньне рабочых у рэдакцыю газэты «Рабочий», даручыць аргаддзелу РК супольна з рэдакцыяй газэты «Рабочий» у працягу двух тыдняў падабраць адпаведныя кандыдатуры для работы ў газэце «Рабочий» з лепшай часткі рабкораў.

9. Лічыць неабходным вакол справы газэты «Рабочий» мабілізаваць грамадзкую думку, завастрыўшы ўвагу работнікаў прэсы і ўсёй пралетарскай прамадзкасьці вакол пытаньня аб нашым друку і разьвіцьця самакрытыкі ў саміх рэдакцыях газэт.

ЧЫРВОНАЯ БЕЛАРУСЬ

УЗМАЦНІМ ЗАГАТОЎКІ ІЛЬНО-ВАЛАКНА І МЯСА.

Рашучы адпор кулацкай агітацыі.

Хлебазагатоўкі ў бягучым годзе праводзіліся ва ўмовах абвастранай клясавай барацьбы ў вёсцы. Мерапрыёмствы савецкай улады і камуністычнай партыі па калектывізацыі вёскі, каапэраваньню беднаты, машынізацыі сельскай гаспадаркі, арганізацыі новых савгасаў і г. д., якія зараз праводзяцца з асаблівай энэргіяй і настойлівасьцю і падтрымоўваемыя асноўнымі масамі сялянства—беднатой і сераднякамі, выклікаюць шалёнае супраціўленьне кулацтва. І гэта зразумела чаму. Кулак разумее, што далейшае разьвіцьцё гэтых мерапрыемстваў і культурны рост вёскі аслабаніць беднату ад кулацкай залежнасьці, падыме дабрабыт усёй асноўнай масы сялянства і зьнішчыць кулака ў вёсцы назаўсёды.

Асабліва кулацтва азлобілася супроць мэтадаў загатовак, давядзеньня пляну да вёскі і кулацкай гаспадаркі, праводзімых у бягучую кампанію ў адносінах да хлеба, бульбы і лёну. Тут гэта асабліва рэзкае супраціўленьне кулака тлумачыцца тым, што гэты мэтады загатовак моцна руйнуе кулацкі ўплыў на асноўныя масы сялянства ўжо сёньня, а ня толькі ў пэрспэктыве, хоць-бы і бліжэйшай.

Хлеб у кулака—гэта зброя эканамічнага прыгнечаньня беднаты і часткі маламоцных сераднякоў і зброя палітычнай барацьбы супроць савецкай улады. Гэтай зброі ў руках кулакоў пакідаць мы ня можам, а ў добраахвотную здачу імі хлеба дзяржаве не даем веры.

Гэта толькі правыя апартуністы лічаць, што кулака можна «уломать» здаць хлеб дзяржаве за павялічаную цану. Кампартыя ў гэта ня верыць і прымяняе іншыя мэтады ўзьдзейнічаньня на кулака ў інтарэсах тых-жа шырокіх сялянскіх мас. Дзяржава значную частку сабранага хлеба накіроўвае ў тую-ж вёску для забясьпечаньня беднаты і адчуваючых патрэбу ў хлебе маламоцных сераднякоў.

За апошні час кулацкімі элемэнтамі распаўсюджваюцца чуткі аб тым, што будзе ўведзена развёрстка на масла, сала, сялянскае палатно і іншыя прадукты сялянскай гаспадаркі. Наогул называецца 36 прадуктаў.

Гэта самая **сапраўдная контр-рэвалюцыйная агітацыя і мана, якую разводзіць ашалелы кулак. Ніякай развёрсткі савецкая ўлада ня ўводзіць** і ніякага абкладаньня ў вёсцы ні на якія прадукты ня будзе. Усе прадукты закупае і будзе закупаць каапэрацыя і Дзяржгандаль па ўстаноўленых дзяржавай цэнах і, зразумела, будуць змагацца з кулаком і спэкулянтам у якую яны-б скуру не апраналіся.

У нашай краіне сялянская беднота і серадняк павінны разумець, што павялічэньне цэн на прадукты сельскай гаспадаркі павінна пацягнуць за сабой павялічэньне цэн на тавары фабрычна-заводзкай вытворчасьці, прамое павялічэньне заработнай платы рабочым і г. д. колам да поўнага абяцэньня нашага чырвонца, ад чаго ў першую чаргу пацерпяць працоўныя—рабочыя і бядняцка-серадняцкія масы вёскі.

Кулацкай агітацыі трэба даць рашучы адпор шляхам шырокай растлумачальнай працы сярод беднаты і практычнай працы нашых нізавых арганізацый, савецкіх і каапэрацыйных органаў па калектывізацыі вёскі, лепшаму культурнаму і гаспарчаму абслугоўваньню асноўных мас сялянства.

Кулак, ухапіўшыся за саломінку, разам з ёю патоне, а бядняцка-серадняцкі блёк, які ўхапіўся за калектывізацыю вёскі, за трактар, за машыну, выйдзе на шырокі шлях сацыялістычна а будаўніцтва.

К. Бэнэк.

Выбрык адміністратараў.

Не пасьпела яшчэ як сьлед разгарнуцца работа па загатоўцы ільну, яшчэ добра памятна дырэктыва партыі і ўраду аб неабходнасьці мабілізацыі ўсіх сіл на **ільняны фронт**, а ўжо некаторыя тупыя безгаловыя людзі **зрываюць** загатоўку, утвараюць на рынку самую нездаровую канкурэнцыю, дапамагаюць ажыётажу.

У Халопеніцкім раёне ня гледзячы не рашэньне вышэйшых партыйных органаў зьнімаецца Дзяржгандльбел з ільняного рынку. Халопеніцкія адміністратары думаюць, што можна абыйсьціся з загатоўкамі ільну і без „чужаземных" купцоў.

Ніякія пратэсты і зазначэньні Халопеніцкага пункту Дзяржгандльбелу супроць такой пастановы не дапамагалі.

Вядома, што Халопеніцкія работнікі Дзяржгандльбелу прымушаны былі паехаць у Менск за растлумачэньнем чаму так загневаліся Халопеніцкі адміністратары па Дзяржгандльбел.

Аб чым гаворыць гэты красамоўны факт? Ён гаворыць аб тым, што на мясцох ня ўсе ведаюць, што такое экспарт, што на мясцох далёка ня ўсё зроблена для ўзмацненьня загатовак ільну.

Трэба тэрмінова прыняць меры да зьнішчэньня такіх нездаровых зьявішч. Загатоўкі па ільну павінны быць выкананы.

Л. Арскі.

Палепшым якасьць бітай птушкі.

(Што сказала пашыраная нарада рабочых).

У першых лічбах лістапада ў „Савецкай Беларусі" быў зьмешчан артыкул аб „парадачках" на адкормачным пункце Дзяржгандльбелу ў Антонаўцы. У сувязі з гэтым артыкулам Дзяржгандльбелам ужыты самыя рашучыя захады да поўнага зьнішчэньня дэфэктаў. Але-ж трэба адзначыць, на гэтым пункце яшчэ маецца шэраг недахопаў, якасьць птушкі кульгае, працоўная дысцыпліна нездавальняючая.

Для поўнага зьнішчэньня паказаных недахопаў была склікана пашыраная нарада рабочых і служачых пункту з удзелам адміністрацыі Дзяржгандльбелу.

Рабочыя зазначалі, што яшчэ да гэтага часу ня зьнішчаны поўнасьцю дэфэкты, яшчэ мае месца нядбайнасьць у рабоце, якасьць птушкі да гэтага часу дрэнная, да гэтага часу адкоры недастатковы, слабы, нездавальняючы.

На пункце маюцца вялікія непаразуменьні наміж работніцамі-шчыпальніцамі украінкамі і беларускамі, адміністрацыяй пункту ня ўжыты рашучыя захады да рэгуляваньня гэтых пытаньняў.

Рабочыя самі прызналі, што працдысцыпліна на пункце адсутнічае, прыходзяць і ўходзяць калі хто хоча, без дазволу, няма ніякага кантролю, няма належнага гаспадарчага кіраўніцтва.

Санітарныя ўмовы не захоўваюцца, здохлая птушка валяецца ў працягу 5-6 дзён і ня выкідаецца. Дастаўка вады ў вельмі дрэнным становішчы. Былі выпадкі папсаваньня гусей і кур.

Пашыраная нарада выказалася за неабходнасьць самых рашучых мер да ўтварэньня на адкормачным пункце лепшых умоў, зьвярнуўшы самую сур'ёзную і строгую ўвагу на якасьць вынушчаемай птушкі, на апрацоўку яе, на сартыроўку, адначасова ўзяўшы на сябе абавязак на захаваньні самай строгай працдысцыпліны.

Рабочыя пункту зразумелі, што пытаньне аб якасьці птушкі ёсьць самае важнае, самая сур'ёзнае пытаньне, бо калі якасьць будзе нездавальняючай, дык уся работа пункту ня будзе нічога варта.

Былі зазначаны дэфэкты **загатоўкі птушкі на мясцох**, рабочыя зьвярнуліся да адміністрацыі аб прыняцьці мер, каб на пунктах загатовак птушкі былі людзі ўпаўне кваліфікаваныя, бо калі прыбывае дрэнна адкормленая птушка, дык яе слаба кормяць.

Л. Ар.

Загатоўкі ільно-валакна праходзяць слаба.

Паводле вестак на 21 лістапада гадавы плян па загатоўцы валакна лёну на ўсёй БССР выкананы сярэднім па 10,9 проц. Месячны-ж плян загатовак валакна выкананы толькі на 31,7 процантаў.

Па асобных акругах лістападаўскі месячны плян выкананы: па Віцебшчыне на 52 проц., Аршаншчыне—на 38,5 проц., Магілеўшчыне—на 26,4 проц., Полаччыне—толькі на 10,9 пр., а па іншых акругах справа з загатоўкай ільно-валакна стаіць яшчэ горш.

Такі слабы тэмп загатовак валакна зрывае выкананьне лістападаўскага пляну і ставіць пад пагрозу выкананьне гадавога пляну, а разам з тым і забясьпечаньне прамысловасьці сыравінай.

Загатоўчыя арганізацыі такі слабы тэмп загатовак ільно-валакна тлумачаць тым, што загатоўчыя пляны не даведзены да асобных вёсак і кулацка-заможных гаспадарак. Калі дапусьціць, што гэта сапраўды так і ёсьць, дык такое становішча пераконвае, што савецкі і загатоўчы апарат на мясцох з надзвычайным спазьненьнем ажыцьцяўляюць тэрміновыя дырэктывы ўраду, бо падрыхтоўчая работа павінна заключацца ня толькі ў разьмеркаваньні, але і ў абгаварэньні плянаў на сходах бядняцка-серадняцкай часткі вёскі.

Паступленьне закантрактаванага валакна па апошніх вестках Наркамгандлю складае толькі 23 проц. колькасьці, якая павінна паступіць паводле дагавораў на кантрактацыі. Урадам у свой час былі дадзены дырэктывы аб абгаварэньні на сходах бядняцка-серадняцкіх кантрактантаў пытаньня аб датэрміновай здачы закантрактаванага валакна, але, як відаць, на мясцох у гэтым напрамку пакуль нічога ня зроблена.

Мясцовыя савецкія і загатоўчыя арганізацыі павінны неадкладна ўзяцца за работу па давядзеньню плянаў загатовак ільна-валакна да асобных вёсак, да кулацкіх і заможных гаспадарак. Бядняцка-серадняцкія масы дапамогуць правесьці гэту работу,—аб гэтым нам сьведчыць практыка загатовак хлеба і бульбы.

Неабходна таксама на сходах кантрактантаў абгаварыць пытаньне аб скарачэньні тэрмінаў здачы закантрактаванага валакна. Трэба прыняць усе меры да ўзмацненьня тэмпу загатовак валакна лёну.

В. З.

Пабудова камунальна-прамысловых электрастанцый.

Інжынэр ВСНГБ т. Арлецоў у гутарцы з нашым супрацоўнікам зазначыў, што будаўніцтва камунальна-прамысловых электрастанцый у 1928-29 годзе ішло ў плянавым парадку. У выніках будаўніцтва мы сёлета зможам атрымаць дадаткова 20 мільёнаў кілёват-гадзін, пры моцнасьці новых электрастанцый каля 6500 кілёват.

Будаўніцтва прамысловых электрастанцый вялося з такім разрахункам, каб забясьпечыць электраэнэргіяй і гарады Барысаў і Бабруйск. Вырашэньне праблемы забясьпечаньня электраэнэргіяй гарадоў праводзілася шляхам пабудовы прамысловых станцый з тым, каб адначасова даваць электрычнае асьвятленьне і гарадом.

У бліжэйшыя дні будзе пушчана электрастанцыя фабрыкі „Чырвоная Бярэзіна" у Барысаве, Бабруйская-ж электрастанцыя дрэваапрацоўчага камбінату працуе ўжо каля з 1 з пал. месяцаў. Трэба адзначыць, што работа па далучэньню горада Барысава да электрастанцыі „Чырвонай Бярэзіны" ня выканана, дзякуючы нядбайным адносінам да гэтага пытаньня Менскага Акрвыканкому. Сапраўды, дагэтуль няма яшчэ адпаведнага праэкту, з прычыны чаго ня было зроблена своечасова заказаў на абсталяваньне Барысаўскай гарадзкой электрычнай сеці. Такім чынам плян 1928-29 г. сарваны. Зараз прыняты меры да распрацоўкі праэкту далучэньня гарадзкой сеці і для здачы заказаў на абсталяваньне з тым, каб увесну 1930 году распачаць работу і весьці яе ўзмацнёным тэмпам.

Ужо прыступлена да работ па пашырэньню Менскай гарадзкой электрастанцыі: будуецца фундамэнт для новай кацельнай, заказы на абсталяваньне зроблены і новая турбіна ў 3750 кілёват пачне працаваць прыкладна з восені 1930 году. Пуск новай турбіны дасьць магчымасьць на першыя годы зьнішчыць вострыя недахопы электраэнэргіі ў Менску. Што-ж датычыцца далейшай праблемы забясьпечаньня электраэнэргіяй Менску, дык у сучасны момант распрацоўваюцца эканамічныя меркаваньні: аб пабудове электрастанцыі на Судабоўскім тарфяным масыве і другі варыянт—пабудова ў Менску электрастанцыі цёплафікацыйнага характару. (З падачай пару і гарачай вады на шэраг прадпрыемстваў, а таксама для ацяпленьня шэрагу вялікіх гарадзкіх будынкаў).

Пушчана таксама ў эксплёатацыю электрастанцыя ў Быхаве на 100 конскіх сіл. Пабудавана і пушчана гідраэлектстанцыя ў Амсьціслаўлі.

Паводле пляну ў 1929-30 гаспадарчым годзе мяркуецца распачаць пабудову электрастанцыі ў Полацку моцнасьцю прыкладна да 2000 кілёват, пашырыць Гомельскую электрастанцыю на 3000 кілёват і пабудаваць у Горках новую моцнасьцю да 1000 кілёват. Побач з гэтым мяркуецца таксама пашырыць электрастанцыю і ў г. Слуцку.

Наогул, на сканчэньне будаўніцтва 1928-29 году і на новае будаўніцтва ў бягучым гаспадарчым годзе будзе затрачана каля 4 мільёнаў руб.

ЗАКОНЫ І ЗАГАДЫ УРАДУ БССР

Пастанова

Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту і Савету Народных Камісараў БССР

пра ўстанаўленьне пэрыядычных набавак да асноўнае заработнае платы некаторых катэгорый пэдагагічных працаўнікоў і загадчыкаў народных дамоў і хат-чытальняў.

Цэнтральны Выканаўчы Камітэт і Савет Народных Камісараў БССР пастанаўляюць:

1. Устанавіць пэрыядычныя набаўкі да асноўнае заработнае платы:

а) пэдагагічных працаўнікоў — усіх школ сацыяльнага выхаваньня, дашкольных устаноў, дзіцячых дамоў, вячэрніх школ рабочай моладзі, вячэрніх школ павышанага тыпу для дарослых; пэдагагічных працаўнікоў і інструктароў—прафэсіяльных школ усіх тыпаў, вучэбна-выторчых майстэрняў, тэхнікумаў, рабочых факультэтаў і ўстаноў для дэфэктуўных дзяцей і падлеткаў;

б) загадчыкаў народных дамоў і хат-чытальняў;

в) пэрыядычныя набаўкі паказаным ў арт. 1 працаўніком, выплачваюцца за кожныя пяць поўных гадоў працы.

Набавак ня можа быць больш за 4.

3. У стаж працы для атрыманьня набавак зялічваюцца наступныя перапынкі ў працы;

а) служба ў Чырвонай армії і флёце, а таксама ў дарэвалюцыйнай армії па мабілізацыі;

б) служба на выбарных пасадах у савецкіх і прафсаюзных органах;

в) служба на пасадзе інспэктара народнай асьветы;

г) час знаходжаньня ў навучальных установах, калі працаўнік паступіў у навучальную ўстанову беспасрэдна з працы якая дае права на набаўкі (арт. 1) і калі ён пасьля сканчэньня навучальнай установы паступіў беспасрэдна на такую працу альбо на пасаду інспэктара народнай асьветы;

д) час знаходжаньня ў дарэвалюцыйны час у астрозе, на каторзе і ў ссылцы за палітычную дзейнасьць;

е) час беспрацоўя, калі беспрацоўны быў зарэгістраваны ў органах працы і атрымліваў або меў права на дапамогу ў парадку сацыяльнага страхаваньня.

4. Працаўнікі, якія маюць права на пэрыядычныя набаўкі (арт. 1), падзяляюцца на 4 групы. Да першай з іх належаць тыя, якія маюць стаж 20 і больш гадоў, да другой—тыя, якія маюць стаж ад 15 да 20 гадоў, да трэйцяй—ад 10 да 15 гадоў, да чацьвертай—5 гадоў.

Кантрольным момантам для вылічэньня поўных гадоў працы зьяўляецца 1 кастрычніка кожнага навучальнага году.

5. Права на залічэньне ў аду з паказаных у арт. 4 груп, для атрыманьня пэрыядычнае набаўкі, маюць толькі тыя працаўнікі, якія прапавалі ня менш 5 гадоў у савецкіх установах, паказаных у арт. 1 гэтае пастановы.

6. Пэрыядычныя набаўкі ўстанаўляюцца ў наступным разьмеры:

а) загадчыкам, настаўнікам і выхавальнікам: у чатырохгодках, школах першай ступені, першым канцэнтры семігодкі, дашкольных установах, дзіцячых дамох, загадчыкам хат-чытальняў і народных дамоў і інструктарам, памянёнага ў арт. 1 гэтае пастановы якія скончылі вышэйшую школу альбо маюць спэцыяльную пэдагагічную асьвету,—72 руб. на год, а для рэшты працаўнікоў гэтых устаноў—60 руб. на год;

б) загадчыкам, настаўнікам і выхавальнікам: у другім канцэнтры семігодкі, школах другой ступені, вопытна-практыкавальных і дасьледчых школах, школах сялянскай моладзі, установах для дэфэктуўных, прафэсійных школах усіх тыпаў навучальна-выторчых майстэрнях, вячэрніх школах рабочай моладзі, вячэрніх школах павышанага тыпу для дарослых, тэхнікумах і рабочых факультэтаў, якія скончылі вышэйшую школу альбо маюць спэцыяльную пэдагагічную асьвету,—150 руб. на год, а для рэшты працаўнікоў гэтых устаноў—100 руб. на год.

7. Пэрыядычныя набаўкі выплачваюцца за кошт мясцовага альбо дзяржаўнага бюджэту па належнасьці.

8. Ажыцьцяўленьне гэтае пастановы пачынаецца: для асоб першай групы з 1 кастрычніка 1929 г., для асоб другой групы—з 1 кастрычніка 1930 г. для асоб трэцяй груны—з 1 кастрычніка 1931 г., для асоб чацьвертай групы—з 1 кастрычніка 1932 г.

9. Калі працаўнікі, паказаныя ў арт. 1 гэтае пастановы да 1-га кастрычніка 1929 г. ужо маюць права на дзьве, тры альбо чатыры набаўкі, дык кожная паступовая набаўка даецца праз 3 гады пасьля атрыманьня папярэдняй.

10. Народнаму Камісарыяту Асьветы, пасьля узгадненьня з Народным Камісарыятам Фінансаў, даручаецца не пазьней як праз 2 тыдні выдаць інструкцыю аб парадку ажыцьцяўленьня гэтае пастановы.

СТАРШЫНЯ ЦЭНТРАЛЬНАГА ВЫКАНАЎЧАГА КАМІТЭТУ БССР
А. Чарвякоў.
СТАРШЫНЯ САВЕТУ НАРОДНЫХ КАМІСАРАЎ БССР
М. Галадзед.
САКРАТАР ЦЭНТРАЛЬНАГА ВЫКАНАЎЧАГА КАМІТЭТУ БССР
А. Хацкевіч.

17-га лістапада 1929 г.
гор. Менск.

Постановление

Центрального Исполнительного Комитета и Совета Народных Комисаров БССР

об установлении периодических надбавок к основной заработной плате некоторых категорий педагогических работников и заведывающих народными домами и избами-читальнями.

Центральный Исполнительный Комитет и Совет Народных Комиссаров БССР постановляют:

1. Установить периодические надбавки к основной заработной плате:

а) педагогических работников—всех школ социального воспитания, дошкольных учреждений, детских домов, вечерних школ рабочей молодежи, вечерних школ повышенного типа для взрослых; педагогических работников и инструкторов—профессиональных школ всех типов, учебно-производственных мастерских, техникумов, рабочих факультетов и учреждений для дефективных детей и подростков;

б) заведывающих народными домами и избами-читальнями.

2. Периодические надбавки, указанные в ст. 1, работникам выплачиваются за каждые пять полных лет работы.

Надбавок не может быть больше 4-х.

3. В стаж работы для получения надбавок зачисляются следующие перерывы в работе:

а) служба в Красной армии и флоте, а также в дореволюционной армии по мобилизации;

б) служба на выборных должностях в советских и профсоюзных органах;

в) служба на должности инспекторов народного просвещения;

г) время нахождения в учебных учреждениях, если работник поступил у учебное учреждение непосредственно с работы, дающей право на надбавки (ст. 1) и если он по окончании учебного учреждения поступил непосредственно на такую работу или на должность инспектора народного просвещения;

д) время нахождения в дореволюционное время в тюрьме, на каторге и в ссылке за политическую деятельность;

е) время безработицы, если безработный был зарегистрирован в органах труда и получал или имел право на пособие в порядке социального страхования.

4. Работники, имеющие право на периодические надбавки (ст. 1), разделяются на 4 группы. К первой из них принадлежат те, которые имеют стаж 20 и больше лет, ко второй—те, которые имеют стаж от 15 до 20 лет, к третьей—от 10 до 15 лет, к четвертой—5 лет.

Контрольным моментом для исчисления полных лет работы является 1 октября каждого учебного года.

5. Право на зачисление в одну из указанных в ст. 4 групп для получения периодической надбавки имеют только те работники, которые работали не меньше 5 лет в советских учреждениях, указанных в ст. 1 настоящего постановления.

6. Периодические надбавки устанавливаются в следующем размере:

а) заведывающим, учителям и воспитателям: четырехлеток, школ первой ступени, первого концентра семилеток, дошкольных учреждений, детских домов, заведывающим избами-читальнями и народными домами, инструкторам, указанным в ст. 1 настоящего постановления,—окончившим высшие учебные заведения или имеющим специальное педагогическое образование,—72 руб. в год, а для остальных работников этих учреждений—60 руб. в год;

б) заведывающим, учителям и воспитателям: второго концентра семилеток, школ второй ступени, опытно-практических и исследовательских школ, школ крестьянской молодежи, учреждений для дефективных, профессиональных школ всех типов, учебно-производственных мастерских, вечерних школ рабочей молодежи, вечерних школ повышенного типа для взрослых, техникумов и рабочих факультетов,—окончивших высшие учебные заведения или имеющим специальное педагогическое образование,—150 рублей в год, а для остальных работников этих учреждений—100 руб. в год.

7. Периодические надбавки выплачиваются за счет местного или государственного бюджета по принадлежности.

8. Осуществление настоящего постановления начинается: для лиц первой группы с 1 октября 1929 г., для лиц второрой группы—с 1 октября 1930 г., для лиц третьей группы—с 1 октября 1931 г., для лиц четвертой группы—с 1 октября 1932 г.

9. В том случае, если работники, указанные в ст. 1 настоящего постановления к 1-му октября 1929 г. уже имеют право на две, три или четыре надбавки, то каждая следующая надбавка выдается через 3 года по получении предыдущей.

10. Народному Комиссариату Просвещения, по согласованию с Народным Комиссариатом Финансов, поручается в двухнедельный срок издать инструкцию о порядке осуществления настоящего постановления.

ПРЕДСЕДАТЕЛЬ ЦЕНТРАЛЬНОГО ИСПОЛНИТЕЛЬНОГО КОМИТЕТА БССР
А. Червяков.
ПРЕДСЕДАТЕЛЬ СОВЕТА НАРОДНЫХ КОМИССАРОВ БССР
Н. Голодед.
СЕКРЕТАРЬ ЦЕНТРАЛЬНОГО ИСПОЛНИТЕЛЬНОГО КОМИТЕТА БССР
А. Хацкевич.

17 ноября 1929 г.
гор. Минск.

Пастанова

Эканамічнай Нарады пры Савеце Народных Камісараў БССР

па пытаньню эканомнага выдаткаваньня чорных мэталяў.

У сувязі з напружанасьцю балянсу чорных мэталяў, Эканамічная Нарада, згодна дырэктывы Савету Працы і Абароны за 6-IX г. г. пра эканомнае выдаткаваньне мэталяў (пр. № 36/434) пастанаўляе:

1) Прапанаваць будаўнічым арганізацыям і органам, якім даручана зацьверджаньне праэктаў усіх відаў будаўніцтва, дапушчаць скарыстаньне будаўнічых мэталяў толькі ў самых неабходных выпадках, замяняя іх іншымі відамі будаўнічых матар'ялаў, кіруючыся Правіламі Камітэту па будаўніцтву пра замену дэфіцытных матар'ялаў недэфіцытнымі (Бюлетэнь СНК 1929 г. № 3, арт. 1 і № 7 арт. 2).

2) Прапанаваць камітэту па стандартызацыі с.-г. машын пры распрацоўцы стандартаў новых машын і прыладаў, а таксама пры пераглядзе існуючых тыпаў машын, імкнуцца да большай эканоміі мэталю, кіруючыся агульнасаюзным стандартам на мэталь і мэталёвыя вырабы.

3) Абавязаць установы, прадпрыемствы і арганізацыі пераглядзець свае заяўкі на 1929-30 г. на патрэбныя ім будаўнічыя мэталы і мэталёвыя вырабы ў бок большага скарачэньня іх, і ўдакладненыя заяўкі прадставіць у НК Гандлю не пазьней і сьнежня г. г. з копіяй Заходняй Канторы Усесаюзнага Мэталюргічнага Сындыкату (УМС). НК Гандлю павінен тэрмінова разгледзіць гэтыя заяўкі і скласьці сводную заяўку на мэталы не пазьней 15 сьнежня.

4) Прапанаваць ВСНГ і заходняй канторы УМС у тыдневы тэрмін устанавіць нормы запасаў мэталю на прадпрыёмствах і сачыць за тым, каб накапленьне запасаў не правышала ўстаноўленых норм.

5) Абавязаць усе ведамствы ўстанавіць нагляд за правідловым выдаткаваньнем мэталяў на прадпрыемствах; органам будаўнічага кантролю пасіліць свой кантроль за эканомным скарыстаньнем мэталяў у будаўніцтве.

СТАРШЫНЯ ЭКАНОМНАРАДЫ БССР
М. Карклін.
КІРАЎНІК СПРАЎ СНК І ЭКАНА БССР
М. Калевіч.

17-XI 29 г.
г. Менск.

Рыхтуемся да Усесаюзнага зьезду ўдарных брыгад.

На зьлёце ўдарных брыгад.

2-XI у Гомелі адчыніўся зьлёт ударных брыгад.

Зьлёт заслухаў рапарты ўдарных брыгад. Першы рапартаваў завод „Пралетары". Камсамольцы арганізавалі 5 ударных брыгад, куды ўцягнулі старых рабочых. Задача па ўцягненьню старых рабочых у сацыялістычнае спаборніцтва выкапана. Маюцца дасягненьні. Калі узяць адаўку чыгуна ў студзені па 1 чалавека прыходзілася 27,01 кгр чыгуна, а ў верасьні ужо 34,8 кгр чыгуна. Брак паменшыўся да 4,5 проц. Павялічылася зьніжэньне сабекошту на 9 проц. Зьменшыліся прагулы: у студзені было 2 проц., а ў верасьні 0,8 проц. у адносінах да ўсіх рабочых. Зарплата павялічылася. У студзені адзін рабочы атрымліваў 3 р. 90 к., а ў верасьні 4 р. 40 к.

Зараз моладзь выклікае старых рабочых на спаборніцтва. Напрыклад рабочы Шлёмін выклікаў на зьніжэньне расцэнак на лапаткі з 65 к. да 25 к. і сам гэта зрабіў. Арганізавана ўдарная брыгада з 18 чалавек у такарным цэху.

У сучасны момант тыя недахопы, на якія ня мелі належнага ўплыву парт'ячэйка і завком, зьнішчаны. Але яшчэ ня ўся моладзь удзельнічае ў вытворчых нарадах.

Другі рапарт робіць „Швэйная фабрыка". Работа на правядзеньню зьлёту распачата 25 сакавіка. Была склікана парада актыву, дзе было выпрацавана шэраг мерапрыемстваў. Гэтае пытаньне высьветлена на мітынгах рабочых. Былі арганізаваны ініцыятыўныя групы па выкараненьню брака, узмацненьні працоўнай дысцыпліны і г. д.

Ёсьць зьніжэньне сабекошту і зьніжэньне прагулаў. Большасьць рабочых павялічыла норму выпрацоўкі з 1 да 5 проц. Шмат рабочых удзельнічае ў сацыялістычным спаборніцтве. Зьлёт прайшоў надта актыўна.

Л. Ліўшыц.

Ад ударных брыгад—да ўдарных цэхаў.

У сувязі з праверкай выкананьня дагавораў па соцспаборніцтву, наглядаецца нябывалы ўздым актыўнасьці рабочых. На чырвонаштандартным „Бальшавіку" ўвесь лаечны цэх аб'явіў сябе ударным.

Да канфэрэнцыі ударных брыгад рабочыя былі своечасова падрыхтаваны. На агульных сходах рабочых ставіліся пытаньні аб задачах ударных брыгад. Абрана 14 чалавек дэлегатаў на акруговую канфэрэнцыю ўдарнікаў.

Лік ударнікаў расьце кожны дзень. Рабочыя утвараюць ударныя цэхі, і хутка чырвонаштандарны „Бальшавік" стане ўдарным заводам.

С. Р—ы.

Да зьезду ўдарнікаў.

Па саюзу мэталістых праведзена работа па падрыхтоўцы рабочых брыгад да канфэрэнцыі, якая склікаецца на 30-XI г. г. На заводах: „Энэргія", „Камунар" і Эльводзе па кожны цэх былі вызначаны па 2 таварышы для правядзеньня падрыхтоўчай работы.

Абраны дэлегаты на канфэрэнцыю: завод „Энэргія"—7 чал.; Камунар—8 чал. і „Эльвод"—5 чал.

* *

Па саюзу дрэваапрацоўчнікаў своечасова была разгорнута работа па падрыхтоўцы рабочых брыгад да канфэрэнцыі. З боку ЦП саюзу было дадзена заданьне ўсім падпараднаваным фабзавкомам аб правядзеньні падрыхтоўчай работы да канфэрэнцыі рабочых брыгад.

На галянтарыйнай фабрыцы „Беларуска" абрана 3 дэлегаты, з якіх 2 жанчыны-работніцы: на фабрыцы цацак „Адраджэньня" абрана 4 дэлегаты, з якіх 1 жанчына і на заводзе дрэваапрацоўчнікаў абрана 5 дэлегатаў.

* *

Скончылася праверка дагавораў на соцыялістычнаму спаборніцтву сярод Менскага саюзу чыгуначнікаў. 75 проц. агульнага ліку рабочых уцягнута ў сац. спаборніцтва.

Па чыгуначным майстэрням утворана 17 ударных брыгад з агульным лікам рабочых у 108 чалавек.

Арганізоўваюцца рабочыя брыгады па праверцы выкананьня дагавораў на сац. спаборніцтву. Гэтымі брыгадамі ахоплена 113 чалавек, з якіх рабочых—105, інжэнэрна-тэхнічнага пэрсаналу 5 чалавек.

Жанчыны ў першых шэрагах ударнікаў.

З пачатку заключэньня соцумоў заводу „Камунар" з заводам „Энэргія" рабочая моладзь заводу першая выкінула выклік усім рабочым і абвясьціла сябе ўдарнай брыгадай. Да моладзі пачалі далучацца і старыя рабочыя. Лік брыгад значна ўзрос. Зараз на заводзе налічваем 13 ударных брыгад. Жанчыны заводу знаходзяцца ў першых шэрагах ударнікаў; яны не арганізоўваюць паасобных жаночых брыгад, а разам з усімі рабочымі працуюць у варштатаў.

На агульных сходах рабочым была растлумачана роль ударных брыгад на ўзьнацьці вытворчасьці па заводзе.

На абедзенных перапынках праводзяцца гутаркі аб акруговай канфэрэнцыі ўдарных брыгад. Абраны дэлегаты на акр. канфэрэнцыю 8 чал.

Ударнік.

ХРОНІКА.

У Прэзыдыуме Менскага Акрвыканкому.

Прэзыдыум Менскага АВК пастанавіў зьвярнуцца ў Савет Народных Камісараў з просьбай абавязаць ВСНГ Бел. пабудаваць у Менску новую электрастанцыю. Інжынэру Алейнікаву даручана праэкт новай электрастанцыі здаць у Маскве на кансультацыю.

* *

Прэзыдыум Акрвыканкому даручыў акруговай інспэкцыі народнай асьветы ажыцьцявіць пастанову ЦВК БССР аб арганізацыі ў Менску клюбу для працоўнага насельніцтва латышскай і літоўскай нацыянальнасьцяў.

* *

Прэзыдыум Менскага АВК вырашыў з 5 сьнежня правесьці перавучот мэдыцынскага пэрсаналу на акрузе. У горадзе перавучот будзе праводзіць інспэкцыя аховы здароўя і павінна будзе скончыць гэту працу ў 2-хтыднёвы тэрмін. Па райёнах перавучот даручана правесьці ў месячны тэрмін райвыканкомам.

Гэтымі днямі ў нашай газэце пісалася аб безгаспадарчасьці ў савгасах Менсельпрому. На апошнім пасяджэньні прэзыдыуму Менскага АВК былі абгаворваны вынікі абсьледваньня савгасаў Менсельпрому.

Прэзыдыум АВК даручыў спэцыяльнай камісіі неадкладна дадаткова абсьледваць становішча савгасаў Менсельпрому, пасьля чаго справу накіраваць у суд для прыцягненьня вінаватых да адказнасьці.

* *

Прэзыдыум АВК дазволіў дарожняму аддзелу склікаць у сьнежні акруговую нараду загадчыкаў райкамгасаў і дарожных майстроў. Нарада паміж іншымі пытаньнямі абгаворыць даклад аб выніках працы па дарожнаму будаўніцтву ў парадку дарожнай павінасьці ў Барысаўскім Самахвалавіцкім і Астрашыцка-Гарадзецкім райёнах. Будзе таксама абгаворан плян дарожнага будаўніцтва за сродкі насельніцтва па 9-ці райёнах акругі (у парадку дарожнай павінасьці і самаабкладаньня).

2000 руб. на пашырэньне дзіцячай тэхнічнай станцыі.

Прэзыдыум ВСНГБел. пастанавіў адпусьціць ЦК ЛКСМБ 2000 руб. на пашырэньне Цэнтральнай дзіцячай тэхнічнай станцыі. Сродкі гэтыя даручана вылучыць трэстам ВСНГ.

Да пабудовы ў Менску галалітавага заводу.

ВСНГ вырашыў пабудаваць у Менску галалітавы завод. Вытворчая мощнасьць заводу прынята ў 350 тон галаліту ў адну зьмену. Кіраўніцтва новым заводам будзе аб'яднана з Менскай галянтарэйнай фабрыкай „Беларуска".

Рабочага на адказную працу.

Рабочы менскага заводу „Дрэваапрацоўнік т. Рыс вылучаны на пасаду намесьніка кіраўніка менскай галянтарэйнай фабрыкі „Беларуска".

За правышэньне цэн да—адказнасьці.

Менскія прыватныя гандляры Алік, Мурох і Людэр купілі жывёлу па павялічанай цане, чым уносілі некаторую дэзарганізацыю ў мясны рынак. Акруговы інспэктарыят гандлю справу аб гэтых гандлярох перадаў у пракуратуру для прыцягненьня да судовай адказнасьці за нарушэньне існуючых загатоўчых цэн.

Наладзіць адкорм сьвіней на аршанскім камбінаце.

23 лістапада пад старшынствам Нар. Кам. Гандлю т. Бэнэка адбылася нарада, у якой прыняў удзел прыехаўшы з Масквы дырэктар хладаэкспарту т. Адамайціс.

Нарада абгаварыла пытаньне аб скарыстаньні сьвінарнікаў і кароўнікаў пры аршанскім камбінаце для адкормачных апэрацый. Нарада даручыла дырэктару камбінату скончыць абсталяваньне сьвінарнікаў і кароўніка з разьлікам, каб з першых дзён сьнежня Белмясгандлю паставіць першую партыю сьвіней для адкорму. Наогул даазена заданьне да 15 сьнежня забясьпечыць пастаўку 1300 галоў сьвіней.

СПРАВАЧНЫ АДДЗЕЛ.

КАТЫРОЎКА ПАЗЫК.

на 25-ае лістапада 1929 г.

	Куп.	Прал.
1 6 проц. выйгр. паз.	5.02	—
Бяспроц. выйгр. паз. 26 г.	129.25	131.25
Выйгр. пазыка 1929 г.	101.45	101.85
10 проц. выйгр. паз. 27 г.	25.72	25.82
3-я сялянск. выйгр. паз. 27 г.	5.05	—
Дзярж. паз. узм. сял. гас.	10.45	10.80
1 выйг. паз. індустр. 27 г.	25.25	25.35
2 „ „ „ проц.	25.64	25.74
2 „ „ „ 6-проц.	25.64	25.74
11 проц. дз. паз. 1928 г.	102.63	102.68
12 пр. рэнтн. паз. 1927 г.	105.80	—

ЛІСТ У РЭДАКЦЫЮ.

У № 263 за 19 лістапада г. г. ў газэце „Савецкая Беларусь" быў зьмешчаны мой артыкул пад загалоўкам „Праверка па бальшавіцу".

Там, дзе перадаюцца словы т. Красьціна, мною дапушчаны дзьве памылкі:

1. За сякеры ўхапіліся, вядома будучы п'янымі, не т. т. Рай і Елін, а жонка т. Рая член КП(б)Б, з сваім мужам членам КП(б)Б т. Расм". Гэта першая мая памылка.

2. Раскатваньне на машынах з прастыткамі і да прастытутак—гэтыя словы былі сказаны на сходзе ня т. Красьціным, а другім членам партыі т. Матусэвіч. Гэта другая мая памылка.

Вось тыя дзьве памылкі, якія я сапраўды дапусьціў, за якія я прашу прабачэньня, але-ж разам з гэтым трэба дадаць і такі факт, які я прапусьціў і які быў пададзены Тав. Красьцінам, Тав. Красьцін, калі яго правяралі заявіў праваркому „Напівалася гэтая кампанія так, што не адчувала пад сабою ног і іх кідала ў рвоту".

Потым, калі было дано праваркомам заключнае слова т. Красьціну, то апошні пачаў адказваць не па сутнасьці тых пяжкіх абвінавачаньняў, якія яму былі высунуты, як члену партыі, цэлым шэрагам выступаўшых таварышоў. Ен адказваў на дробязі, што прымусіла старшыню праваркома т. Пэдэра паставіць перад тав. Красьцінным так пытаньне „Ці прызнаеш ты на ўсе 100 проц. тыя абвінавачаньні, якія табе высунуты выступаўшымі таварышамі. Адказы як бальшавік". Тав. Красьцін заявіў праваркому і сходу так: „прызнаю на ўсе 100 проц".

Цяпер мяне вельмі зьдзіўляе, як гэта т. Красьцін, які як член партыі спачатку прызнае на ўсе 100 проц., а потым (газ. „Савец. Белар." № 264, за 21-XI 29 г.) катэгарычна адмаўляецца ад прыпісаных яму слоў і з абурэньнем называе іх хлусьнёй.

З камуністыч. прывітаньнем
Сяргей Лодысеў.
23-XI 29 г.

РАСТЛУМАЧЭНЬНЕ.

У 233 нумары за 11 кастрычніка нашай газэты зьмешчан артыкул пад назвай „Под высоким покровительством", у якім пісалася, што т. Валодзька (старшыня Віцебскага АВК) дапамог „устройцца", зьнятаму з працы ў Полацкім АКРЗА за цэлы шэраг злачынстваў, былому штабсканітану Аўсеевічу, і па-другое, што тав. Валодзька „устроіў" свайго брата ў Бел. Дзярж. с-г. акадэмії.

Рэдакцыя атрымала па першаму пытаньню адэкватнае бюро Віцебскага акругкому КП(б)Б, у якім даводзіцца, што Аўсеевіч быў застаўлены на пасадзе рэвізора па земляўпарадкаваньню не тав. Валодзькам. Бюро акругкому даручыла гэтую справу высьве ліць АКК-РСІ.

Другое абвінавачаньне т. Валодзька таксама не адпавядзе сапраўднасьці, бо брату Валодзькі, які скончыў рабфак, куды ён быў пасланы Гомельскім губпрафсаветам, не патрабавалася пратэкцыя. Стыпэндыю ён атрымаў па ходайніцтву ячэйкі і прафкому.

КІНО.

„Небаскроб" і „Генэрал".

Гэтыя „амэрыканскія" фільмы маюць між сабой шмат падобнага. Яны ня маюць зьместу, аднолькава апалітычны і аднолькава глупы. Але ў іх ёсьць і разыходжаньні. Так, напр., „Небаскроб" скрыўляе рабочы быт, паказваючы ў фільму толькі бойкі і зьдзекі аднаго над другім.

Да гэтага таксама дадаецца абавязкова і сантымэнтальны раман, без якога не абыходзіцца ніводная „дабра парадачная" амэрыканская фільма.

„Гэнэрал"—старамодны „гістарычны", калі магчыма так сказаць, фільм. Уся трукавасьць гэтага фільму абумоўлена вайной. Але паміж кім, калі і завошта? Невядома. Але гэта і не патрэбна ў гэткага роду фільму, грунтоўнай мэтай якога зьяўляецца «захапляючы» авантурызм.

Гэтыя фільмы ня варты болей ніводнага слова.

Але аб значэньні мастацкага савету варта пагаварыць. Гэта значэньне захована ў тым, што ні гледачы на тое, што мастацкі савет прызнаў „Небаскроб" шкодным фільмам, „Небаскроб" ідзе ўжо 2-гі тыдзень, прычым першы тыдзень ён шоў у самай „Культуры".

Паўстае пытаньне, навошта мучыць і скліваць людзей для гутарак, калі погляды гэтых людзей зводзяцца да нуля?.

С. Лэндаў.

ТЭАТР-КІНО

КІНО-ТЭАТР „КУЛЬТУРА". З панядзелка 25 лістапада **„ПАБОЧНАЯ ЖАНЧЫНА"** і кіно-хроніка беларяржкіно «Новы горад», Гомельшчына. Пачатак а 7 гадзіне. Каса а 5 гадзіне.

КІНО «ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ». З панядзелка 25 лістапада. Выключны мастацкі фільм **„ЧОРНЫ ПАРУС"** драма у 6 частках. Звыш праграмы: ХРОНІКА САВКІНО № 65. Пачатак а 7 гадзіне.

1-Ы ДЗІЦЯЧЫ КІНО-ТЭАТР „ЮНЫ ПІАНЭР". З панядзелка 25 лістапада **„ВАНЬКА ІМСЬЦІВЕЦ"** у 6 частках. каса адчынена штодня з 2 гадзін дню.

ЧЫРВОНАЯ БЕЛАРУСЬ

КІНО „ПРАЛЕТАРЫ". З панядзелка 25 лістапада. Бэстэр Кітон у амэрыканскай камэдыі **„ГЕНЭРАЛ"** у 7 част. Звыш праграмы: кіно-хроніка „Савкіно" № 64.

Чытайце і выпісвайце **„САВЕЦКУЮ БЕЛАРУСЬ"** БЕЛАРУСКУЮ ШТОДЗЁННУЮ ГАЗЭТУ ОРГАН Ц. В. К. БЕЛАРУСІ

УМОВЫ ПАДПІСКІ: 1 мес.—90 кап. 3 мес. 2 р. 70 кап. 6 мес.—4 руб. год — 8 руб.

АДКРЫТ ПРЫЁМ ПАДПІСКІ на 1930 г.

„САВЕЦКАЯ БЕЛАРУСЬ" ПАВІННА БЫЦЬ у руках кожнага, актывіста, члена савету, настаўніка, аграчома, урача і наагул савецкага служачага.

Падпіска прымаецца: паштовымі канторамі і аддзяленьнямі, лістаносцамі, упаўнаважанымі канторы газэты, кіёскамі кантрагэнцтва друку і канторай газэты (Менск, 2-гі Дом Саветаў)

СЬПЯШАЙЦЕСЯ ПАДПІСАЦЦА

СУДОВЫ ВЫКАНАЎЦА 1 ВУЧАСТКУ АРШАНСКАЙ АКРУГІ абвяшчае, што ў выкананьне пастановы нарсуду . Воршы і райёну ад 23 кастрычніка 1929 году. на 29 лістапада а 9 гадзіне раніцы ў м-ку Багушэўскае Аршанскай акругі **назначаюцца ТАРГІ** на продаж маемасьці належачай Эйдміну Ісаку і Вола Шмуйлы; якая складаецца: Смалакурны завод з поўным абсталяваньнем і будынкамі пры ім. АЦЭНКА 4720 РУБЛЁЎ. Аб усіх спраўках можна даведацца ў часы заняткаў у канцэляры судвыканаўца г. Воршы. Прадаваемую маемасьць агледзець на месцы таргоў у дзень продажу. Судвыканаўца АНТАШКЕВІЧ.

Полацкі акруговы ЗАГС паведамляе, што 15 сьнежня 1929 году будзе слухацца справа аб скасаваньні шлюбу гр-ні Бедзеравай Рахіль Шоламавы з гр-нам Бедзеравым Мордухам Хінавым.

Нарсуд города Мазыра на падставе прысуду ад 11 кастрычніка 1929 году па арт. 237 крым. код. за абразу дзяньня гр. Яхімовіч Надзежду Канстанцінаўна нанесеньня оскорбленьня гр. Трізно Марыі Макароўна абвяшчае грамадзянскае ганьбаваньня гр. Яхімовіч Надзежды Канстанцінаўны жых. гор. Мазыра жана рабочага.

Нарсуд города Мазыра на падставе прысуду ад 28 кастрычніка 1929 г. па арт. 223, п. а па крым. код. за абразу дзяньня гр. Маневіча Андрэя Алесова, нанесеньня пабоеў гр. Маневіч Антоніны Іванаўны, абвяшчае грамадзянскае ганьбаваньне гр. гр. Маневічу Андрэю Алесеву селініні вёскі Бібікі Нарэўлянскага раёна.

Народны суд Лагойскага раёну Менскае акругі, на падставе прыгавору ад 14-га верасьня 1929 г. і 196 і 213 арт. крым. код. абвяшчае грамадзянае ганьбаваньне старш ні Лагойскага с-г. крэдытнага таварыства Шкілёнку Язэпу Язэпаву за нядбалыя адносіны дахаваньня наштоўных папер у выніку чаго 20-V-29 г. з таварыства ўкрадзены аблігацыі І-й пазыкі індустр. на суму 665 руб., якія хаваліся ў незамкненым на замок яшчыку.

РЕМЕСЛА столярное, токарное, слесарное, жестяницкое, кузнечное, гончарное, переплетное. Кройка, шитье, вязанье, вышиванье, плетенье, выпиливанье, выжиганье, вырезанье, и мн. др. изучайте по книге П. ЛЕОНЬТЬЕВА „РУЧНОЙ ТРУД" 384 стран., 199 рисунков с образцами работ и с указаниями по самодельному изготовлению инструментов. Цена с пересылкой 3 руб. Высылает Изд-во БРОКГАУЗ-ЕФРОН, Ленинград, внутри Гостин. Двора, 124-8.

ЗГУБЛЕНЫ:

— Пасьведчаньне нарвіла Кэда К. І.,—выд. енскім Загсам, кв. 895.

— Лекавая кніжка Бурштэйна Я. А.,—выд. Менакрстрахкасай, кв. 896.

— Бюлетэнь аб хваробе Кабрынскага Х. Я.—выд. Рэчыцкай фабр. амбул. кв. 631.

— Квіт за № 18, выд. прыёмшчыкам Атзманчукам на імя Гуззва П., кв. 631.

— Сяброўскі білет № 728 Ліўшыц Х. Б.—выд. Рэчыцк. аддз. Сельгаслесрабоч. кв. 631 п.

— Сяброўскі білет Лешчынскага І. І.—выд. Рэчыцк. аддз. сельгаслесрабоч. кв. 631.

— Кніжка дапрызыўніка наражк. 1907 Літошка Ф. М.—выд. Рэчыцк. РВК, кв. 631.

— Пасьведчаньне Брундукова К. А.,—выд. Віцебскім Акрвык., кв. 631п.

— Выканаўчы ліст за № 1522 Бовчака Е. Г.,—выд. нар. суд. Рэчыцк. р-ну, кв. 631п.

— Камсамольскі білет № 82854 Мінсвіч М. Н.,—выд. Мазырск. Акружк., кв 631п.

— Вучотна-конская кніжка № 3435 Найстэтэра П., выд. Каралінскім РВК, кв. 126п.

— Дзьве вучотна-конск. карткі на імя Мажутка Навума і Мікалая, выд. Чэрвенскім пэт. урачом, кв. 128п.

— Канэрац. кніжка № 436 Мануліка П. К., выд. с.-гасп. крэдытн. т-вам, кв. 129п.

— Мэтрычн. выпіс наражк. 1909 г. Драздовіна, выд. Мазырск. аддз. ЗАГС'а, кв. 130п.

— Паявая кніжка Мазуркевіча, выд. чыгуначн. праўл. ст. Мазыр, кв. 131п.

— Дапрызыўнак кніжка Хмеля І. А., выд. Барысаўск. 4 стр. палком, кв. 132п.

— Камсамольскі білет № 59250 Купрацэвіч І. выд. Жыткавіцк. раён. арганізац. КСМ, кв. 133п.

— Пасьведчаньне Багданоўскага М. А., выд. Горацкай с.-г. акад. у 1925 годзе, кв. 134п.

— Сяброўская кніжка № 6/36452 Гэроніка І. Н., выд. Барысаўск. саюзам будаўнікоў, кв. 139п.

— Пасьведчаньне за № 967, выд. Барысаўск. камгасам аб рэгістрац. зямельнага вучастку і пабудаваньне на ім дому і хлеву на імя Сівінскага М. О., кв. 140п.

— Конская кніжка № 3231 Давідчыка А. В., выд. Юравіцкім РВК, кв. 141п.

— Сяброўскі білет № 1329 Круглік М. М., выд. саюзам хімікаў, кв. 142п.

— Бесарацоўн. карткі за № 5-1 за Кастрычнік і Лістапад м-цы, выд. Барысаўскай біржай працы на імя Палянскага Р., кв. 143п.

— Асабовая карт. Кругліка С., выд. Барысаўск. Ваенкаматам, кв. 144п.

— Чырвонаарм. кніжка Новікава Я. І., выд. 5 стр. палком, кв. 145п.

— Пасьведчаньне аб скаканьні Н-Барысаўскай сямігодкі за № 59 і характарыстыка за № 167 на імя Файнельсона І. М., кв. 108п.

— Сяброўскі білет Аўлукова Д. М., выд. Барысаўск. саюзам харчавікоў, кв. 108п.

— Сяброўскі білет за № 63391 Ейнскага І. І., выд. Барысаўск. саюзам папяровых прамысловасьці, кв. 108п.

— Сяброўскі білет Юран С. П., выд. Барысаўск. саюзам прац. зямлі і лесу, лекавая кніжка і мопрская, кв. 108п.

— Вайсковы дакумэнт Маласая І. Д., выд. Барысаўск. вайсковым камісар. кв. 116п.

— Дапрызыўная кніжка Тарасенка С. гр-на жых. у Чэрвенск. р-не Менакругі, кв. 117п.

— Пасьведчаньне аб вучоце коняй Кыгадло А., кв. 125п.

Гал